КАБ НЕ ТРАПІЦЬ У «ПАСТКУ»

4

КАЛІ ПАКУСАЛІ НАСЯКОМЫЯ

8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 ЛІПЕНЯ 2021 г. СЕРАДА № 137 (29506)

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Аляксандр КАДЛУБАЙ, намеснік міністра адукацыі:**

*«Сёлетняя ўступная кампанія не зведае глабальных змен. У сістэме адукацыі і не павінна быць рэзкіх перамен. Гэта датычыцца і ўступнай кампаніі. Сёння мы знаходзімся на этапе падачы дакументаў. У апошні дзень падача дакументаў у ВНУ завершыцца ў 17.00. У астатнія дні «крок» складае тры гадзіны — 12.00, 15.00 і 18.00. У асноўным усе класічныя прынцыпы сёлета захаваліся, за выключэннем таго, што свае карэктывы ўносяць інфарматызацыя і эпідсітуацыя. Ужо з мінулага года пачалі стварацца анлайн-кабінеты, дзе абітурыенты могуць прайсці частку рэгістрацыі, што паскарае працэдуру і не стварае чэргаў. Пакуль складана прагназаваць, якія спецыяльнасці будуць запатрабаваныя ў абітурыентаў сёлета. Але мы з вамі ведаем, што ў Беларусі традыцыйна высокія прахадныя балы на медыцынскія, ІТ-спецыяльнасці, эканамічны блок. Радуе, што расце прэстыж педагагічнай прафесіі».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА, ЯК НА ФРОНЦЕ, — ВЫСТАЯЦЬ І ПЕРАМАГЧЫ»

## Пра што Прэзідэнт гаварыў на нарадзе, прысвечанай прыярытэтам знешняй палітыкі краіны

**На нараду сабраліся кіраўнікі беларускіх замежных установ. У пачатку сустрэчы кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што знешнепалітычная стратэгія Беларусі мае патрэбу ў карэкціроўцы.**

«Мы тут, у Мінску, ужо з вясны мінулага года бачылі, як паступова нагнятаецца напружанасць, але недаацэньвалі гэта, нарастала антыбеларуская актыўнасць у сацыяльных сетках, змянялася не ў лепшы бок рыторыка нашых апанентаў у Бруселі і Вашынгтоне. Яшчэ да выбараў актывізаваліся асобныя дзеячы і арганізацыі, ішлі інфармацыйныя ўкіды, апрацоўвалася грамадская думка і тут, і там», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што выбарчая кампанія мінулага года і санкцыйнае цкаванне, якое пачалося пасля яе, наглядна паказалі, што знешнепалітычная стратэгія мае патрэбу ў сур'ёзнай карэкціроўцы. ***«Мы павінны дакладна разумець, што адбываецца вакол нас, якое наша месца ў гэтай сістэме каардынат, што імкліва змяняецца, наколькі мы здольныя хутка і прафесійна адаптавацца, адказваючы на сучасныя выклікі і пагрозы. У такой сітуацыі годны адказ могуць даць толькі прафесійныя і, самае галоўнае, адданыя сваёй справе і краіне кадры»***, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

### «СВЕТ НЕ АБМЯЖОЎВАЕЦЦА КРАІНАМІ ЕЎРАПЕЙСКАГА САЮЗА»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што дыпламатычная служба падобная да ваеннай, з тым толькі адрозненнем, што дыпламат змагаецца за інтарэсы Айчыны на далёкіх подступах да яе граніц.

Па яго словах, ад кампетэнцый, мэтанакіраванасці і адданасці справе залежыць, «пачнуць гаварыць сапраўдныя гарматы ці не».

«Прыйшоў час усю сістэму сур'ёзна ўзварухнуць. Яшчэ раз падкрэсліваю: кіраўніку ўрада, Адміністрацыі, міністру трэба даць прынцыповую ацэнку рабоце з кадрамі нашага знешнепалітычнага ведамства. У міністэрстве павінны дакладна разумець, што сучасны свет не абмяжоўваецца толькі краінамі Еўрапейскага саюза. Ён значна шырэйшы», — заявіў Прэзідэнт.

Беларускі лідар прывёў прыклады Кітая, Індыі, Пакістана, В'етнама, Турцыі, з якімі ў Беларусі добрыя адносіны, таксама як і з цэлым шэрагам дзяржаў у Афрыцы, Лацінскай Амерыцы, на Блізкім Усходзе. Ён адзначыў, што ў супрацоўніцтве з гэтымі краінамі ёсць велізарны патэнцыял і бязмежныя магчымасці для краіны не гіганцкага па эканоміцы, па тэрыторыі і насельніцтву памеру.

«Мы проста не заўсёды ўмеем гэтымі магчымасцямі эфектыўна карыстацца. А сёй-той не выказвае асаблівага жадання ў тым, каб выканаць дасягнутыя на ўзроўні хоць бы кіраўніка дзяржавы дамоўленасці. Пералічаныя краіны не выстаўляюць ніякіх ультыматумаў і не заклікаюць «даціскаць» Беларусь, як нашы асобныя суседзі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

Ведай нашых

# САПРАЎДНЫ БАЕЦ

**Студэнтка, спартсменка і проста прыгажуня! А галоўнае — вельмі сумленны, адказны, рашучы чалавек. Дзяўчына з Гомеля свой летні адпачынак прамянала на аператыўныя дзяжурствы. Хрысціна АСАДЧАЯ — баец студэнцкага атрада матросаў-ратавальнікаў, якія сёлета заступілі на службу на вадаёмах Гомельшчыны. Яна на сваім прыкладзе паказала, як гэта — першай у рэгіёне выступіць у падобным статусе.**

СТАР. 5

Спажывец

# ГОРАД-САД. ВІШНЁВЫ

## Па сапраўдныя беларускія вішні едзем у Глыбокае

**Вішня пладаносіць у сярэдзіне лета, і любяць яе ўсюды. Таму «вішнёвыя сталіцы» ёсць у многіх краінах. У Літве гэта горад Жагарэ, у Харватыі — Лаўран, у ЗША — Трэвер-сіці, у Расіі — Уладзімір. У Беларусі «вішнёвай сталіцай» лічыцца гарадок Глыбокае, што месціцца ў Віцебскай вобласці, недалёка ад Полацка. Менавіта сюды ў сярэдзіне і канцы ліпеня едуць па сапраўдныя беларускія вішні. Мы таксама вырашылі з'ездзіць у Глыбокае ў «вішнёвы сезон» — пакаштаваць экалагічна чыстыя ягады і ўдакладніць, як правільна выбіраць гэтую смакату і што з яе варта гатаваць.**

СТАР. 9

## КАРАТКА

- Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб прызыве на тэрміновую ваенную службу ў жніўні—лістападзе.
- **Масавая ўборка збожжавых стартавала ў Беларусі.**
- Брэсцкі тэхнічны ўніверсітэт будзе рыхтаваць мытнікаў.
- **Беларусь за студзень—май паставіла Украіне электраэнергіі на рэкордныя $25 млн.**
- Залацістыя шчуркі зноў загняздзіліся ў Белавежскай пушчы.

ISSN 1990 — 763X

21137

9771990763008

# «ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА, ЯК НА ФРОНЦЕ, — ВЫСТАЯЦЬ І ПЕРАМАГЧЫ»

## У СВЕЦЕ ІДЗЕ ВАЙНА

«Кожныя тры-чатыры гады мы сустракаемся ў такім фармаце для ацэнкі работы сістэмы органаў дыпламатычнай службы. Як вы разумееце, цяперашняя нарада праходзіць у асаблівых умовах. Тое, што цяпер робіцца ў сучасным свеце, можна ахарактарызаваць адным ёмістым словам «вайна», — сказаў беларускі лідар.

Ён заўважыў, што, на шчасце, гэтая вайна яшчэ не набыла абрысаў гарачага канфлікту. Яна вядзецца ў кабінетах, сродках масавай інфармацыі, сацыяльных сетках, у эканоміцы, фінансах. Універсальнага сродку спыніць яе ў чалавецтва на сёння няма, як няма і ўніверсальнага сродку ад каранавіруса. Пандэмію Аляксандр Лукашэнка назваў адным з трыгераў, які справакаваў новую хвалю крызісу, абвастрыўшы ўсе існуючыя супярэчнасці ў свеце: пратэкцыянізм, нацыянальны эгаізм, гонку ўзбраенняў, рэваншызм і канфлікты на этнаканфесійнай глебе. І Беларусь як адкрытая і сучасная краіна адчула на сабе ўсе наступствы сусветнага крызісу.

***«Апагеем сталі выбарчая кампанія і спробы дэстабілізацыі грамадства і звяржэння ўлады. Як рыхтуюцца і рэалізоўваюцца такія каляровыя бліцкрыгі, вы добра ведаеце. Без знешняга ўмяшання яны немагчымыя»***, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

## НУМАР АДЗІН — ЗНЕШНІ ГАНДАЛЬ

Прэзідэнт пацікаваўся, наколькі суадносяцца сродкі, якія выдаткоўваюцца на ўтрыманне сістэмы органаў дыпламатычнай службы, з рэальнымі вынікамі іх дзейнасці, галоўным чынам па абароне нацыянальных інтарэсаў.

«Як і раней, для нас задачай нумар адзін застаецца знешні гандаль. Мы невялікая, адкрытая краіна з экспартаарыентаванай эканомікай. Без экспарту мы не выжывем. ***Няхай вас не палохаюць заходнія так званыя сектаральныя санкцыі. На нашы тавары заўсёды ёсць попыт. Трэба толькі прыкласці крыху больш намаганняў. Прададзім сваю прадукцыю — вырашым пытанне з санкцыямі. Мы сваёй працай павінны зрабіць іх неэфектыўнымі, незаўважнымі для грамадзян. Мы павінны і на гэтым полі, як на вуліцы ў жніўні — верасні, паставіць усіх на месца, хто скосу глядзіць на нашу краіну і бярэцца за эканамічную зброю»***, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

З гэтай прычыны знешнеэканамічная дзейнасць Міністэрства замежных спраў, а дакладней, экспарт беларускай прадукцыі — прыярытэт з прыярытэтаў. Тым больш, як заўважыў Прэзідэнт, бізнес за мяжой ужо на ўсю моц заклікае сваіх палітыкаў не ўжываць санкцыі да вытворцаў беларускай сыравіны, паліва, угнаенняў, харчавання, драўніны, паўфабрыкатаў. «Там добра разумеюць, што ў выніку абмежаванні ўдараць і па іх канчатковай прадукцыі, і па спажыўцах», — сказаў ён.

## «ВЫ СЁННЯ БАЙЦЫ, АЛЕ БЕЗ ЗБРОІ»

Аляксандр Лукашэнка даручыў кіраўніку ўрада падрабязна ахарактарызаваць вынікі работы на знешнеэканамічным напрамку, паказаць рэальны ўнёсак паслоў у развіццё гандлёва-эканамічных адносін з іншымі краінамі, а калі трэба, то і прапанаваць кадравыя рашэнні.

«Хопіць утрымліваць лайдакоў, якія ходзяць з важным выглядам па прыёмах. Гэта трэба, але гэта самае апошняе ў спісе. ***Сёння патрэбныя дыпламаты-практыкі, спецыялісты сваёй справы, патрыёты, якія не пабаяцца заявіць прэтэнзіі і адстаяць гонар сваёй краіны.*** «Вы сёння байцы, але без зброі», — заявіў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што дыпламатаў успрымаюць як эліту грамадства, але гэтая элітарнасць павінна выяўляцца ў выхаванасці, выключнай прыстойнасці і найвышэйшым прафесіяналізме, а не ў фанабэрыстасці і пачуцці перавагі над іншымі людзьмі. «Вы ж абсалютна ўсе самі выхадцы з народа, павінны быць адлюстраваннем яго спрадвечнага патрыятызму, традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, працавітасці. Павінны гэтаму адпавядаць, а не ісці па шляху маральнага разлажэння і дэградацыі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

## «МЫ — НАШЧАДКІ ВЯЛІКІХ ПЕРАМОЖЦАЎ»

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што ўсяму свету трэба распавесці страшную праўду пра жахі вайны, пра генацыд беларускага народа, пра польскую акупацыю ў міжваенны перыяд і іншыя аб'ектыўныя факты, якія мы з-за сваёй прыстойнасці саромеліся прад'явіць. ***«Прыйшоў час сарваць маскі з усіх акупантаў і калабарантаў. У адрозненне ад іх, мы — нашчадкі вялікіх пераможцаў, якія вярнулі мір народам Еўропы, выратавалі ад знішчэння не адно пакаленне. Краіны і народы Еўропы нам павінны дзякаваць за тое, што зрабіла папярэдняе пакаленне, а не душыць нас санкцыямі»***, — сказаў ён.

І, па словах беларускага лідара, работнікі беларускіх замежных устаноў павінны кожны дзень расказваць гэтую праўду людзям у краінах сваёй акрэдытацыі, выступаць у сродках масавай інфармацыі, размяшчаць у сацыяльных сетках. «Трэба біць праціўніка яго ж зброяй. Вось толькі на нашым баку праўда і доблесць нашых продкаў. А іх доля — бездапаможныя выкрыкі, шантаж і рэваншызм», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

## «ПРОСТА ВАРУШЫЦЦА ТРЭБА»

Таксама Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што для абароны сваіх прадпрыемстваў трэба больш актыўна выкарыстоўваць механізмы міжнародных арганізацый. ***«Усе, хто возьме намер ануляваць вынікі тэндараў, адмяніць кантракты на закупку айчыннай прадукцыі за мяжой, павінны дакладна разумець, што гэта ім проста так з рук не сыдзе. Трэба больш актыўна ствараць прэцэдэнты, напрацоўваць практыку абароны эканамічных інтарэсаў»***, — перакананы кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што ў Беларусі дастаткова юрыстаў-міжнароднікаў, а прадпрыемствы разам з пасольствамі павінны «ваяваць за кожны трактар, грузавік або камбайн, за кожную тону мінеральных угнаенняў».

Прэзідэнт паставіў задачу зрабіць так, каб праблемы і складанасці, выкліканыя заходнімі санкцыямі, не паўплывалі на развіццё краіны.

«Санкцыі мы павінны, як і была пастаўлена мною задача ўраду, пераадолець без аніякіх праблем. Мы палову выпрабленага прадаём, і гэта не сотні мільярдаў долараў, і рынкі нашы зразумела дзе. На тых рынках супраць нас санкцыі не ўвялі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў некаторых беларускіх прадпрыемствах з-за санкцый узніклі праблемы з закупкай камплектуючых у Еўропе. Ён заўважыў, што калі б у краіне больш актыўна займаліся імпартазамяшчэннем, то падобных праблем можна было б пазбегнуць. Як прыклад ён прывёў Мінскі аўтамабільны завод, які сумесна з кітайскімі партнёрамі арганізаваў у індустрыяльным парку «Вялікі камень» вытворчасць рухавікоў. «Проста варушыцца трэба», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

***«Як маем 3,5 % ВУП па паўгоддзі, так павінны вытрымаць і да канца года. Так, вельмі складана, так, цяжка. Галоўная задача, як на фронце, — выстаяць і перамагчы»***, — заявіў Прэзідэнт.

## «ЯНЫ НАС ДУШАЦЬ, А МЫ ІХ БУДЗЕМ АБАРАНЯЦЬ?»

Аляксандр Лукашэнка адказаў на папрокі ў адрас Беларусі наконт барацьбы з нелегальнай міграцыяй. Кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што не разумее, як можна, з аднаго боку, уводзіць у дачыненні да Беларусі санкцыі, а з другога — патрабаваць ад яе абароны на граніцах: «Яны нас душаць, а мы іх будзем абараняць? Слухайце, ці не наіўна гэта? Гэта не наіўна, гэта ўжо па-вар'яцку. Ужо здурнелі да таго, што пачынаюць патрабаваць тое, што наогул не трэба прамаўляць услых», — заявіў ён.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на стаўленне літоўскага боку да мігрантаў, якіх затрымліваюць пры перасячэнні граніцы, і параўнаў умовы ўтрымання бежанцаў з канцэнтрацыйнымі лагерамі. У сувязі з гэтым Прэзідэнт расказаў пра інцыдэнт, які гэтымі днямі здарыўся на беларуска-літоўскай граніцы. Пра гэта таксама былі паказаны сюжэты на беларускіх тэлеканалах. Размова пра групу з 26 мігрантаў (пераважна жанчын і дзяцей), якіх прымусова, пагражаючы зброяй, адправілі праз граніцу з літоўскай на беларускую тэрыторыю.

«Адабралі ў іх дакументы, парвалі ў іх на вачах пашпарты і растапталі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Узброеныя. Вывелі іх на беларуска-літоўскую граніцу, паставілі напарадзе, як фашысты (памятаеце, у наступленне бралі мірных жыхароў і пасылалі напарадзе сябе). Вось гэтак яны выстраілі гэтыя 26 чалавек і пагналі праз граніцу, адкрыўшы стральбу паверх галоў. Збілі, цяпер некаторыя ў бальніцы знаходзяцца».

У ліку пацярпелых была нават цяжарная жанчына. «Яна што, гэта жанчына і яе дзеткі, пагрозу ўяўляла Літве і Еўрасаюзу? Не, яна ўцякала ад вайны, якую яны развязалі на Блізкім Усходзе, пачынаючы ад Алжыра і сёння заканчваючы Сірыяй», — эмацыянальна адрэагаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў, што такія дзеянні не могуць заставацца без наступстваў. «Вы ведаеце, што сёння раніцай адбываецца? Як толькі на Блізкім Усходзе, у Іраку і іншых краінах, нават Турцыі, убачылі гэтыя кадры (пра інцыдэнт з групай пацярпелых мігрантаў. — **Зв.**), ужо КДБ і МУС па маім даручэнні працуюць, каб не дапусціць сюды людзей са зброяй, яны рвуцца сюды са зброяй. «Навошта пакрыўдзілі цяжарную жанчыну?» — адно пытанне ў іх. І вы ведаеце, гэта радыкальныя мусульмане», — сказаў беларускі лідар.

«І яны што, разлічваюць, што я буду трымаць тут на граніцы ўзброеных гэтых іракцаў, курдаў і іншых? Не думайце, я іх тут трымаць не буду. Я вас папярэдзваю сумленна і адкрыта. Таму, перш чым рабіць нейкія крокі, думайце, хто вам процістаіць», — дадаў Прэзідэнт.

## КІРУЮЧЫСЯ ЖЫЦЦЁМ І ПРАКТЫКАЙ

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дыпламаты павінны працаваць у інтарэсах народа і краіны.

«Міністр мяне ўвесь час пры прызначэнні пераконвае, што тут працуюць найлепшыя. У мяне тады ўзнікае пытанне: дык няўжо вырашылі адсядзецца некаторыя, пачакаць, пакуль сціхне бура? Відавочна адно: так справа далей не пойдзе. Або вы з народам, краінай, Прэзідэнтам, тварам якога вы з'яўляецеся там і які вас туды накіроўвае. Або такія кадры краіне не патрэбныя. Ужо прабачце за шчырасць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка даручыў прэм'ер-міністру Раману Галоўчанку і кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Ігару Сергеенку сур'ёзна падысці да пытання кадравага камплектавання беларускіх дыппрадстаўніцтваў у Еўропе.

«Слухайце, ну навошта нам там трымаць кучу дыпламатаў, калі мы наогул з імі не гандлюем, а палітычныя адносіны, дыпламатыя — яна не проста адсутнічае, яна на шкоду дзяржаве. Калі там патрэбны адзін пасол і памочнік, ну пакіньце іх, здыміце ім двухпакаёвую кватэру і няхай працуюць. Пойдзе (развіццё супрацоўніцтва. — **Зв.**) — дабавім. Трэба проста з пункту гледжання жыцця і практыкі да гэтага падысці», — падкрэсліў беларускі лідар.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### ❍ Каментарый у тэму

Беларусь не плануе ў бліжэйшы час зачыняць якія-небудзь свае замежныя ўстановы ў той ці іншай краіне ЕС. Пра гэта заявіў журналістам, адказваючы на пытанне карэспандэнта БелТА, **міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ.**

Каментуючы вынікі нарады ў кіраўніка дзяржавы па прыярытэтах знешняй палітыкі на сучасным этапе, на якую былі запрошаныя кіраўнікі беларускіх замежных установ, міністр адзначыў, што размова не ішла аб неабходнасці зараз зачыніць пасольствы ў той ці іншай краіне або скараціць іх колькасны склад. Уладзімір Макей нагадаў, што ў пачатку года на ўзроўні Прэзідэнта ўжо абмяркоўваліся пытанні аптымізацыі замежных устаноў, былі прыняты рашэнні, якія цяпер знаходзяцца ў стадыі выканання.

«Гаворка (на праведзенай сёння нарадзе) ішла пра тое, каб паглядзець, як будзе развівацца сітуацыя ў плане далейшага санкцыйнага супрацьстаяння паміж Беларуссю і, так званым, калектыўным Захадам. Мы трымаем руку на пульсе і, вядома ж, будзем глядзець. Калі мы будзем бачыць, што ў нас няма выразнай канкрэтнай перспектывы ў плане гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння з той ці іншай краінай, то мы будзем уносіць адпаведныя прапановы ва ўрад і Прэзідэнту», — заявіў кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства.

«На дадзеным этапе мы не плануем проста заўтра зачыняць нашы замежныя ўстановы ў той ці іншай краіне ЕС. Але, вядома ж, мы будзем назіраць за сітуацыяй. Мы лічым, што ЕС можа быць для Беларусі нармальным партнёрам, але для гэтага трэба вярнуцца на тыя разумныя асновы суіснавання, якія былі ў нашых кантактах некаторы час таму», — дадаў міністр.

У сваю чаргу прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка ў гутарцы з журналістамі выказаў меркаванне, што нельга дапусціць нейкіх рэзкіх кан'юнктурных шараханняў. «Вось сёння, няхай, у нас сталі больш халоднымі адносіны з той ці іншай дзяржавай, значыць, нам трэба пасольства да мінімуму скарачаць. Калі гэта не звязана, як выпадак, скажам, з Літвой, з агрэсіўнымі цынічнымі дзеяннямі, якія ў прынцыпе цягнуць нават на разрыў дыпадносін. Але мы не прыхільнікі такіх жорсткіх мер. Таму калі гэта не датычыцца такога роду мэтанакіраваных дзеянняў, то я не прыхільнік шараханняў», — сказаў ён.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, ёсць вывераны падыход да гэтага пытання: «З улікам таго, што Прэзідэнт яшчэ раз гэтую задачу паставіў і мы цяпер пакуль бачым, што выбудоўваецца нейкі новы фармат адносін па лініі ЕС—Беларусь, да канца года мы павінны прыняць вывераныя рашэнне па аптымізацыі як сеткі беларускіх замежных устаноў, выходзячы з нашых інтарэсаў у новай рэальнасці, так і цэнтральнага апарата МЗС, яго ўнутранай структуры».

«Палітыка той ці іншай краіны змяняецца таксама досыць рэзка. Таму мы не будзем ісці на повадзе ў імгненнай кан'юнктуры. Рашэнні будуць вывераны», — акцэнтаваў увагу Раман Галоўчанка.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Блізкая ўлада

# Сенатары — у рэгіёне

## Члены Савета Рэспублікі правядуць адзіны дзень прыёму грамадзян

**У чацвер, 22 ліпеня, з 11.00 члены Савета Рэспублікі правядуць адзіны дзень прыёму грамадзян у выканкамах Віцебскай вобласці, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента. У прыватнасці:**

— **КАЧАНАВА Наталля Іванаўна,** старшыня Савета Рэспублікі, будзе праводзіць прыём грамадзян з 15.00 у Новалукомскім гарадскім выканаўчым камітэце (г. Новалукомль, вуліца Энергетыкаў, 15; тэлефон для запісу 8-02133-6-77-15);

— **СІВЕЦ Сяргей Міхайлавіч,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве — у Талачынскім раённым выканаўчым камітэце (г. Талачын, вул. Леніна, 1; тэлефон для запісу 8-02136-5-13-72);

— **РУСЫ Міхаіл Іванавіч,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні — у Дубровенскім раённым выканаўчым камітэце (г. Дуброўна, вул. Камсамольская, 18; тэлефон для запісу 8-02137-5-45-01);

— **РУНЕЦ Таццяна Аркадзеўна,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах — у Лепельскім раённым выканаўчым камітэце (г. Лепель, вул. Ленінская, 6; тэлефон для запісу 8-02132-6-78-86);

— **ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці — у Браслаўскім раённым выканаўчым камітэце (г. Браслаў, вул. Савецкая, 119; тэлефон для запісу 8-02153-66-1-89);

— **ДЗЕРКАЧ Юрый Мікалаевіч,** член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці — у Аршанскім раённым выканаўчым камітэце (г. Орша, вул. Аляксандра Астроўскага, 2; тэлефон для запісу 8-0216-51-12-45);

— **ЖЫНГЕЛЬ Алег Валянцінавіч,** член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах — у Глыбоцкім раённым выканаўчым камітэце (г. Глыбокае, вул. Леніна, 42; тэлефон для запісу 8-02156-2-58-30);

— **ЛЯЎКОВІЧ Ірына Пятроўна,** член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах — у Бешанковіцкім раённым выканаўчым камітэце (г. п. Бешанковічы, вул. Чуклая, 13; тэлефон для запісу — 8-02131-6-40-47);

— **МАЦВЕЕЎ Уладзімір Сямёнавіч,** член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні — з 11.00 у Мёрскім раённым выканаўчым камітэце (г. Мёры, вул. Дзяржынскага, 17; тэлефон для запісу 8-02152-5-14-55); з 14.00 — у Шаркаўшчынскім раённым выканаўчым камітэце (г. п. Шаркаўшчына, вул. Камсамольская, 15; тэлефон для запісу 8-02154-6-12-32);

— **ШЧАСНЫ Анатоль Тадэвушавіч,** член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве — у Лёзненскім раённым выканаўчым камітэце (г. Лёзна, вул. Леніна, 79/2; тэлефон для запісу 8-02138-5-25-50).

Папярэдні запіс ажыццяўляецца з 19 да 21 ліпеня з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00.

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю генеральнага дырэктара рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па жывёлагадоўлі» ПАПКОВА Мікалая Андрэевіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю першага генеральнага дырэктара авіякампаніі «Белавія» ГУСАРАВА Анатоля Мікалаевіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Кыргызскай Рэспубліцы КОЗЫРА Аляксандра Віктаравіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні былому ўласнаму карэспандэнту газеты «Звязда» па Гомельскай вобласці Уладзіміру Рыгоравічу Пернікаву з прычыны напаткаўшага яго вялікага, непапраўнага гора — смерці ЖОНКІ Галіны Данілаўны.**

Будзьце пільныя!

# КАЛІ РАЗРАД МОЖА СТАЦЬ СМЯРОТНЫМ

## Падрыхтоўка да рыбалкі вылілася ў трагедыю

**Электратраўму, несумяшчальную з жыццём, атрымаў на сваім лецішчы ў Веткаўскім раёне Гомельскай вобласці мужчына 1957 года нараджэння. Гамяльчанін рыхтаваўся да рыбалкі. Прынаду — дажджавых чарвякоў — ён вырашыў не накапаць рыдлёўкай, як гэта звычайна робіцца, а здабыць дзякуючы металічнаму штыру, да якога пры дапамозе кабеля падвёў 220 вольт ад разеткі...**

Такім чынам мужчына спрабаваў аблегчыць сабе работу. Калі чарвякі пачалі з'яўляцца на паверхні, рыбак выцягнуў штыр, не адключыўшы яго ад электрасеткі. Электрычны разрад, які прызначаўся для чарвякоў, «прайшоўся» па чалавеку — мужчына загінуў.

Па дадзеным факце Веткаўскім раённым аддзелам Следчага камітэта праводзіцца праверка. На месцы здарэння працавалі і спецыялісты ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Гомельскай вобласці. Судовыя эксперты выявілі на целе пацярпелага электраметкі, характэрныя для паражэння электрычным токам, — пашкоджаныя ўчасткі скуры, праз якія адбыўся ўваход і выхад электрычнага разраду.

Як паведамілі ва ўпраўленні Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Гомельскай вобласці, удар электрычным токам часцей за ўсё адбываецца ў выніку няшчасных выпадкаў або парушэння тэхнікі бяспекі падчас карыстання электрычнасцю. «Ступень праяўлення электратраўмы залежыць ад шэрагу фактараў, да якіх адносяцца метэаралагічныя ўмовы: у прыватнасці, спёка, падчас якой узмацняецца потавыдзяленне і зніжаецца супраціўленне дзеянню току, павышаная вільготнасць, — удакладнілі ў Дзяржкамітэце судэкспертыз. — Акрамя таго, уплываюць стан здароўя і ўзрост чалавека: старыя і дзеці, а таксама людзі з шэрагам хранічных захворванняў больш уразлівыя да дзеяння току. Яго сіла з'яўляецца больш паражальнай, чым напружанне. Калі сіла току малая, а напружанне вялікае, то судакрананне выклікае болевы эфект і, як правіла, не прыводзіць да смяротных зыходаў. Ад значэння сілы току, які праходзіць праз чалавека, залежыць эфектыўнасць згубнага ўздзеяння электрычнасці на арганізм. Таму пры карыстанні электрычнасцю неабходна заўсёды выконваць тэхніку бяспекі і не дазваляць малым дзецям самастойна карыстацца электрапрыборамі».

— З пачатку 2021 года на падкантрольных Дзяржэнерганагляду аб'ектах у краіне адбыўся 21 няшчасны выпадак удару электрычным токам: 9 здарэнняў адбылося на вытворчасці і 12 у быце, — паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Дзяржэнерганагляду Андрэй ЛЯГОЦІН.** — Усяго пацярпелі 23 чалавекі, з якіх 15 загінула, пяцёра атрымалі цяжкія вытворчыя траўмы. Варта адзначыць, што летась за аналагічны перыяд адбылося 14 няшчасных выпадкаў удару электрычным токам (5 на вытворчасці і 9 у быце).

Як адзначаюць у Дзяржэнерганаглядзе, найбольш частымі прычынамі няшчасных выпадкаў электратраўматызму сярод насельніцтва з'яўляюцца ажыццяўленне рыбнай лоўлі токаправоднымі вудзільнамі ў ахоўных зонах паветраных ліній электрапередачы, пранікненне на энергааб'екты з мэтай крадзяжу камплектуючых або ў ходзе дзіцячых гульняў. На вытворчасці ж такімі прычынамі звычайна з'яўляюцца пашырэнне рабочага месца, невыкананне тэхнічных мерапрыемстваў, звязаных з бяспекай правядзення работ, у тым ліку невыкананне праверкі адсутнасці напружання на токаправодных частках, парушэнне правілаў аховы электрычных сетак пры выкананні работ у ахоўных зонах ліній электрапередачы.

**Вераніка КАНЮТА.**

### У мэтах прадухілення няшчасных выпадкаў электратраўматызму Дзяржэнерганагляд рэкамендуе:

— не выкарыстоўваць самаробныя электрычныя прыборы і падаўжальнікі, электрычныя прыборы і падаўжальнікі з відавочнымі пашкоджаннямі ізаляцыі, штэпсельных злучэнняў, корпуса;

— не залазіць на апоры паветраных ліній электрапередачы;

— не адчыняць дзверы, не пранікаць унутр і не падымацца на трансфарматарныя падстанцыі;

— не падымацца на дрэвы, дзе паміж галінамі праходзяць правады паветраных ліній электрапередачы;

— не набліжацца да абарванага провада паветранай лініі электрапередачы, які ляжыць на зямлі, бліжэй чым на восем метраў;

— не накідваць на правады паветраных ліній электрапередачы разнастайныя прадметы;

— не гуляць каля трансфарматарных падстанцый і пад лініямі электрапередачы;

— не пакідаць малых дзяцей без нагляду каля трансфарматарных падстанцый і пад лініямі электрапередачы;

— знаходзячыся на рыбалцы, не лавіць рыбу ў вадаёмах паблізу і пад паветранымі лініямі электрапередачы;

— не праходзіць з паднятай уверх раскладзенай вудай пад правадамі паветраных ліній электрапередачы;

— не парушаць патрабаванні забараняльных плакатаў, устаноўленых у месцах праходжання паветраных ліній электрапередачы праз аўтамабільныя дарогі і вадаёмы;

— не спыняцца, не запраўляць і не рамантаваць аўтатранспарт і сельскагаспадарчую тэхніку пад паветранымі лініямі электрапередачы;

— не ажыццяўляць рамонт электраўстановак і электраабсталявання самастойна, давяраць правядзенне дадзеных работ толькі кваліфікаваным спецыялістам.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Ахвярамі тэракта ў Багдадзе стала каля 30 чалавек

Паводле даных тэлеканала Al Arabiya, ахвярамі аднаго з найбуйнейшых у сталіцы за апошні час тэрактаў сталі сама меней 30 чалавек, яшчэ каля 60 атрымала раненні. На ахыўленым рынку ў населеным пераважна шыітамі ўсходнім раёне іракскай сталіцы Мадзінат-Садр спрацавала выбуховае прыстасаванне. На той момант там было асабліва шматлюдна, паколькі многія іракцы прыйшлі цэлымі сем'ямі, каб купіць усё неабходнае перад адным з галоўных мусульманскіх свят Ід аль-Адха (Курбан-Байрам, сёлета ў большасці арабскіх краін прыпадае на 20-22 ліпеня). Выбух прывёў да значных разбурэнняў, загарэлася некалькі лавак, людзі ў паніцы спрабавалі ўцячы па вузкіх праходах паміж гандлёвымі радамі далей ад месца, дзе спрацавала бомба. У сілавых структурах сталіцы пацвердзілі, што ў тэракце было выкарыстана самаробнае выбуховае ўстройства. З'явілася інфармацыя, што тэрарыстка-смертніца прывяла ў дзеянне так званы пояс шахіда. Выбух быў настолькі моцны, што людзей, якія знаходзіліся ў некалькіх дзясятках метраў ад эпіцэнтра, шпіталізавалі ў крытычным стане. Прэм'ер Ірака Мустафа аль-Казымі распарадзіўся правесці тэрміновае расследаванне ўсіх абставін таго, што здарылася. Акрамя гэтага, ён аддаў загад затрымаць камандуючага аднаго з падраздзяленняў сіл федэральнай паліцыі ў Мадзінат-Садр.

## Чацвёртая хваля каранавіруса пачалася ў Францыі

Тут фіксуюць чарговую хвалю пандэміі. Пра гэта паведаміў на брыфінгу па выніках пасяджэння Савета міністраў у Елісейскім палацы афіцыйны прадстаўнік урада Габрыель Аталь, адзначыла ТАСС. «Тэмпы распаўсюджвання віруса цяпер больш высокія, чым на любым з папярэдніх этапаў. За тыдзень колькасць выпадкаў заражэння павялічылася ўдвая, — адзначыў Габрыель Аталь. — Цяпер мы штодня рэгіструем каля 10 тысяч новых выпадкаў інфіцыравання». Паводле яго слоў, у 80 працэнтах выпадкаў заражэння гаворка ідзе пра варыянт «дэльта», які не абмінуў ніводны рэгіён Францыі. Урад краіны ўхваліў праект закона аб узмацненні жорсткасці мер барацьбы з COVID-19, які будзе ўнесены ў парламент.

## Японія выдаткавала на правядзенне Алімпіяды $15,4 млрд

Пра гэта заявіў генеральны сакратар Аргкамітэта «Токіа-2020» Тасіра Мута на 138-й сесіі МАК, паведаміла ТАСС. Такійская Алімпіяда павінна была прайсці год таму, але з-за пандэміі каранавіруса была перанесена на 2021 год. Тасіра Мута адзначыў, што бюджэт Гульняў пасля пераносу быў перагледжаны і на стварэнне бяспечнага асяроддзя для правядзення Алімпійскіх гульняў было дадаткова выдаткавана 900 мільёнаў долараў. Раней прэзідэнт Міжнароднага алімпійскага камітэта Томас Бах распавёў, што МАК унёс 1,7 мільярда долараў, каб Алімпійскія і Параалімпійскія гульні ў Токіа прайшлі паспяхова. Як вядома, XXXII летнія Алімпійскія гульні ў Токіа пройдуць з 23 ліпеня да 8 жніўня. У спаборніцтвах возьме ўдзел каля 12,5 тысячы спартсменаў з больш чым 200 краін. Будзе разыграна 339 камплектаў узнагарод у 33 відах спорту.

Вяртанне да тэмы

# БІЗНЕС-ПРЫГОДЫ «ВЕНТЫЛЯТАРШЧЫКАЎ» НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ,

## ці Як менеджары с пыласосамі мімікруюць пад камунальнікаў

**У мінулым месяцы карэспандэнт «Звязды» падзялілася з чытачамі ўласнай гісторыяй, як у сваёй кватэры ў Мінску яна ледзь не стала ахвярай дзейнасці нядобрасумленных прадпрымальнікаў. Ёй і суседзям па шматпавярховіку настойліва прапаноўвалі сумнеўную паслугу — прачысціць вентыляцыйныя каналы ў кватэры. Не ўсім удалося пазбегнуць камерцыйнай пасткі. Цяпер падобныя «набегі» ўсё часцей здараюцца на Гомельшчыне. Гісторыі чысткі вентыляцыі і «аблягчэння» кішэняў спажыўцоў паслугі — як пад капірку.**

Алгарытм дзеянняў менеджараў па продажы паслугі таксама аднолькавы. Мэтавая аўдыторыя камерцыйнага ахопу — пажылыя грамадзяне і маці ў дэкрэтным водпуску, якія застаюцца дома адны. Лічыцца, што гэта і самыя эмацыянальна ўразлівыя катэгорыі грамадзян. Ім прапануюць палепшыць стан вентыляцыі. У выпадку адмовы прадстаўнікі прыватных фірмаў палохаюць гаспадароў нібыта велізарным штрафам ад аварыйных службаў і адключэннем газу з-за небяспечнага стану ў кватэры. Для вырашэння «праблемы» настойліва пераконваюць падпісаць дагавор. Сума — 175 рублёў, гэта цана са зніжкай. Навязваюць паслугу нават таму, хто не з'яўляецца ўласнікам жылля, не мае рэгістрацыі па адрасе. Звяртаюцца і да схемы, калі спачатку вельмі хутка праводзяць нейкую маніпуляцыю ў вентыляцыйнай адтуліне пры дапамозе бытавога пыласоса, а ўжо потым, калі паслуга аказаная і назад ходу няма, патрабуюць паставіць подпіс у дакументах.

### «Станоўчы» эфект

Маркетынгавая пастка — у спецыфіцы паслугі. Напрыклад, калі ўтварыўся засор каналізацыі або паўсталі праблемы з ацяпленнем — гэта ў ЖЭС. Вентыляцыя ж не на слыху. Давяраюць нязваным гасцям і таму, што менеджары наўмысна мімікруюць пад камунальшчыкаў (выкарыстоўваюць падобную спецвопратку, кажуць, што ад ЖКГ). Гэта асабліва добра «выстрэльвае» сярод людзей пенсіённага ўзросту, якія прывыклі без лішніх пытанняў падпарадкоўвацца распараджэнням адказных службаў. Да таго ж камунальныя паслугі асацыіруюцца ў грамадзян з дзяржаўнымі сацыяльнымі стандартамі. Выходзіць, што такія «візіты» псеўдакамунальнікаў дрэнна адбіваюцца на даверы людзей да супрацоўнікаў афіцыйных камунальных прадпрыемстваў. Чым жа кіраваца, каб не трапіць у няёмкае становішча і ў той жа час не адмовіць рэальным камунальным аварыйным службам?

**Намеснік генеральнага дырэктара прадпрыемства «Жыллёва-камунальная гаспадарка Гомельскай вобласці» Алег СПІРЫДОНАЎ** звяртае ўвагу:

— Згодна з заканадаўствам, на сённяшні дзень работы па праверцы, прачыстцы, ліквідацыі няспраўнасці прыдамовых вентыляцыйных каналаў уваходзіць у тэхнічнае абслугоўванне жылых дамоў і выконваецца непасрэдна тымі арганізацыямі, якія займаюцца абслугоўваннем гэтых дамоў без спагнання якой-небудзь платы, паколькі плата за тэхнічнае абслугоўванне спаганяецца з грамадзян штомесяц згодна з тымі сумамі, якія выстаўляюцца за аплату жыллёва-камунальных паслуг. У выпадку ўзнікнення праблем грамадзянам неабходна звяртацца непасрэдна ў сваю арганізацыю па абслугоўванні ці пакідаць заяўку ў службе 115.

### Яшчэ раз, каб было зразумела

*За тым, каб сістэма вентыляцыі працавала спраўна, сочаць спецыялізаваныя арганізацыі на падставе дагавораў, заключаных з прадпрыемствамі ЖКГ раёнаў. Яны ажыццяўляюць планавае абследаванне, пры неабходнасці вентшахты прачышчаюць. Але гэтыя паслугі спецыялісты выконваюць у рамках дагаворных абавязацельстваў бясплатна для жыхароў. Ніякія іншыя арганізацыі не маюць права ўмешвацца ў работу ўнутрыдамовых інжынерных сістэм і вентыляцыі ў прыватнасці, а тым больш патрабаваць за гэта плату.*

Спецыялісты прапаноўваюць запомніць некалькі правілаў, як не скаціцца ў «камунальную параною», але і не трапіць у сітуацыю з навязанай платнай паслугай. Па-першае, перад пакватэрным абходам любых афіцыйных дзяржаўных службаў на дзвярах пад'ездаў павінна з'явіцца карэктная аб'ява з датай, назвай арганізацыі, якая праводзіць абследаванне, або той, што замовіла паслугу, звыклым нумарам гарадскога тэлефона для сувязі. Другое правіла — перад пачаткам любых работ у кватэры, якія асабіста ўласнік або арандатар не заказваў, трэба звязацца з дыспетчарам ЖЭСа. Правіла № 3 — нельга падпісваць дакументы, не праверыўшы, хто з імі звяртаецца. Важна крытычна ставіцца да любых аб'яў на пад'ездзе, якія носяць пагрозлівы ці катэгарычны характар. Не трэба лянавацца тэлефанаваць у ЖКГ па ўдакладненні.

Камунальнікі звяртаюць увагу і на тое, што варта памятаць — ніякіх тэрміновых работ у кватэры, калі толькі гаспадар сам не бачыць іх неабходнасці (адбылося затапленне, адчуваецца пах газу) ніхто не можа навязваць.

### Бізнес-прыгоды ў Гомелі

У падобных справах складана даказаць, што факт махлярства меў месца. Распаўсюджвальнікі тавару — афіцыйна зарэгістраваная фірма. У дагаворы ўказаны кошт тавару, пад дакументам чалавек без прымусу ставіць свой подпіс. Такія грамадска-працэсуальныя адносіны разбіраюцца ў судовым парадку. І ёсць у Гомелі тыя, хто вырашыў пайсці такім шляхам. Толькі за апошнія тры дні ў Гомельскую гарадскую арганізацыю грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства абароны спажыўцоў» звярнуліся тры заяўнікі з просьбай прадстаўляць іх інтарэсы ў судзе. Яны маюць намер дабівацца скасавання дагавораў-заяў на выкананне работ па ачыстцы ўнутрыквацярнай вентыляцыі. Усе заяўнікі-спажыўцы — сталыя людзі. Для іх кошт навязанай паслугі — гэта значная частка пенсіі. Многія прыйшлі па дапамогу праз пэўны час, калі ўжо выйшаў тэрмін аплаты па дагаворы, а за пратэрміноўку па плацяжы пагражае налічэнне пені, — адзначае **юрыст-кансультант Гомельскай гарадской арганізацыі ГА «Беларускае таварыства абароны спажыўцоў» Андрэй БАБІЧ.**

— Не ўсе пажылыя людзі, якія звярнуліся, разумеюць, што ўвогуле за дагавор яны падпісалі, — тлумачыць Андрэй Іванавіч. — А між тым, акрамя дагавора, усімі падпісана заява на выканне паслугі і акт аб сдачы-прыёмцы выкананых работ па ачыстцы вентыляцыі.

Менеджары-«вентылятаршчыкі» пры выкананні паслугі даюць спажыўцам падпісаць і юрыдычна ўдала складзены дадатак да дагавора. Гэта ліст з друкаваным тэкстам аб тым, што супрацоўнік фірмы-падрадчыка паслугі правёў поўную кансультацыю па ўладкаванні ўнутрыквацярнай вентыляцыі, распавёў аб тым, якім чынам будзе аказана паслуга, агучыў яе кошт.

— Не ўсе спажыўцы, якія падпісалі падобны дагавор на навязаную ім паслугу, адважацца судзіцца з фірмай, на гэта і разлічваюць падобныя прадпрымальнікі, — дадае Андрэй Бабіч.

Ён адзначае, што ў іску ў суд можна апеляваць да пункта 1-га артыкула № 116 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў»: калі ў момант аказання паслугі спажыўцу не была дадзена ўся неабходная поўная і праўдзівая інфармацыя аб паслузе, ён мае права патрабаваць у судзе скасавання дагавора і вяртання заплачаных грашовых сродкаў.

Спажыўцы могуць настойваць і на тым, што «здзелка» была заключана пад уплывам падману, з прычыны збегу цяжкіх абставін на вельмі не выгадных для сябе ўмовах. Можна апеляваць і да таго, што менеджары кампаніі падаюць сваю паслугу як нешта жыццёва неабходнае. Хай даказваюць, што да іх паслугі вентыляцыя дрэнна працавала ці стала працаваць лепш, чым раней.

Прынамсі, у арганізацыю днямі звярнулася маладая мама з Гомеля. Настасся па той жа схеме трапіла ва ўласнай кватэры ў камерцыйную пастку «вентылятаршчыкаў» і падпісала дагавор. Яна атрымала кансультацыю юрыста, даслала афіцыйную прэтэнзію на адрас прыватнай кампаніі па чыстцы вентыляцыі, нават з'ездзіла ў офіс прадпрыемства. Кажа, дома, на сямейным сходзе ўсё ж такі вырашылі не падаваць іск ў суд, а аплаціць квітанцыю за аказаную паслугу. Гамяльчанка прыняла рашэнне заплаціць, але зрабіла сур'ёзны вывад на будучае. Цяпер для маладой мамы важна папярэдзіць іншых людзей, якія могуць таксама апынуцца ў яе становішчы. Яна, дарэчы, вельмі дапамагла ў падрыхтоўцы гэтага матэрыялу — паказала ўсе дакументы, якія падпісваюць спажыўцы падчас візіту «вентылятаршчыкаў» і сваю прэтэнзію да прыватнай кампаніі з адказам на яе.

На гэтым тыдні ў Гомелі адбудзецца першае судовае пасяджэнне. На ім юрыст Гомельскай гарадской арганізацыі ГА «Беларускае таварыства абароны спажыўцоў» будзе прадстаўляць інтарэсы пажылой сямейнай пары гамяльчан. Спецыяліст па спажывецкіх справах звярнуў увагу, што прыватная кампанія па ачыстцы вентыляцыі зарэгістравана ў Гомелі толькі месяц таму. Трэба рыхтавацца да таго, што гэта толькі пачатак эмацыянальна вострых заяў ад спажыўцоў, якія найбольш уразлівыя ў камерцыйных правілах гульні таварна-грашовых адносін.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

## «СВАБОДНАЯ ПАЛІЦА» —

так называецца цікавы праект, ажыццёўлены ў Мядзельскай цэнтральнай бібліятэцы. На вуліцы, побач з будынкам бібліятэкі, у незвычайнай зашклёнай шафе, падобнай на ствол магутнага дрэва, упрыгожанай постацямі буслоў, выстаўлены кнігі. Іх могуць часова ўзяць аматары чытання. Да таго ж гэтую кніжную калекцыю кожны жадаючы можа дапоўніць выданнямі з уласнай бібліятэкі.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Запрашальнік

## Фестываль эпохі ранняга Сярэднявечча пройдзе ў Чавускім раёне

**Раённае свята эпохі ранняга Сярэднявечча «У Госці да радзімічаў» пройдзе 31 ліпеня ў Чавускім раёне.**

Як расказала карэспандэнту БелТА **метадыст па традыцыйнай культуры раённага Цэнтра культуры і вольнага часу ў горадзе Чавусы Алеся ДАЛЕЦКАЯ,** этнаграфічны фестываль заснаваны на стылізацыі культуры Сярэднявечча. Месцам правядзення традыцыйна стане Замкавая гара ў аграгарадку Радамля, які ў даўнія часы быў цэнтрам племені радзімічаў. Тут у X стагоддзі на левым беразе ракі Радучы яны заснавалі свой горад.

У праграме этнафэсту — канцэрты, тэатралізаваныя паказы, баі рэканструктараў з Мінска і Жодзіна, майстар-класы, выставы-продажы рамесных вырабаў. Акрамя таго, гасцям свята прапануюць паўдзельнічаць у танцах і іншых забаўках, наведаць інтэрактыўныя зоны, гандлёвыя рады і музей пад адкрытым небам.

«Адным з запамінальных момантаў стане конкурс сярод сельскагаспадарчых арганізацый Чавускага раёна «Радзіміцкія забавы», — расказала Алеся Далецкая. — Удзельнікам будзе прапанавана аформіць і прэзентаваць свае падворкі ў стылі ранняга Сярэднявечча, вырабіць традыцыйны радзіміцкі абярэг і пачаставаць журы стравай па сярэднявечным рэцэпце».

Каманды будуць змагацца ў сіле, спрыце і трапнасці. Ім трэба будзе кінуць дзіду ў кольца на адлегласці 5 м, злавіць голымі рукамі як мага больш рыбы, прайсці паміж мяшкамі, якія разгойдваюцца, і не закрануць іх, а таксама пранесці каромысла з поўнымі вёдрамі па бервяне і не разліць ваду.

Фестываль праводзіцца ўжо ў восьмы раз.

Землякі

Наталля ШЭНДЗЕРАВА:

# «БАЛАНС ВА ЎСІМ — МАЁ ГАЛОЎНАЕ ДАСЯГНЕННЕ»

**Элегантная, прыгожа адзетая і ў той жа час простая і стрыманая — менавіта так можна апісаць нашу суразмоўніцу. Наталля Шэндзерава — прыклад таго, як жанчына можа самарэалізоўвацца і быць паспяховай — і ў сям'і, і ў кар'еры. Сакрэты сямейнага і прафесійнага жыцця ад прадпрымальніцы, фларыста і ўладальніцы аграсядзібы са Слаўгарада чытайце ў нашым матэрыяле.**

Ужо пры першай сустрэчы з Наталляй Алегаўнай Шэндзеравай відавочныя ініцыятыўнасць і вытрымка гэтай жанчыны. Магчыма, справа ў тым, што першы свой бізнес яна пачала будаваць у канцы экстрэмальных 1990-х. Тады яна, маці дваіх дзяцей, дыпламаваны дызайнер, шукала сваё месца ў вірлівым жыцці.

*— Нарадзілася і вырасла я на Слаўгарадчыне, адукацыю атрымлівала спачатку ў Ленінградзе, а пасля развалу СССР прыехала давучвацца ў Мінск. Тут і сустрэла свайго мужа.*

Будаваць уласную сям'ю маладыя вырашылі на малой радзіме Наталлі Алегаўны. І гэты крок быў рызыкоўным, бо Слаўгарадскі раён амаль цалкам трапіў у зону радыеактыўнага забруджвання пасля Чарнобыльскай катастрофы. Менавіта ў 1990-я пачалося масавае перасяленне людзей з гэтых тэрыторый. А Шэндзеравы, наадварот, не пабаяліся прыехаць сюды. Тут у маладой сям'і нарадзіліся дзеці — Аліна і Саша. Але для дызайнера работы па прафесіі ў невялікім горадзе не было. Таму калі сыну, які ў сям'і малодшы, было тры месяцы, наша гераіня пачала займацца гандлем, што пасля ператварылася ў справу яе жыцця.

*— Жыццё ў 1990-я было нялёгкае. Свет змяняўся. А мне хацелася пэўнай стабільнасці, хоць бы фінансавай, каб ведаць і планаваць сваё «заўтра». Таму я і прыйшла ў камерцыю. Пазней вырашыла займацца менавіта кветкамі, гэтая ніша ў Слаўгарадзе тады была свабодная. І муж мяне падтрымаў. Так з'явілася наша кветкавая крама.*

Вось ужо 16 гадоў букеты і кошыкі з кветкамі, сабраныя рукамі нашай гераіні, карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод жыхароў і гасцей Слаўгарада. І гэта не дзіўна, бо Наталля Алегаўна развіваецца, удасканальвае сваё майстэрства: у 2012 годзе яна атрымала дадаткова спецыяльнасць — фларыст, каб займацца любімай справай на сапраўды прафесійным узроўні.

*— Я пайшла вучыцца, бо работа з кветкамі патрабуе высокага прафесіяналізму. Тэхналагічны працэс захоўвання кветак і букетаў складаны. Трэба дакладна прытрымлівацца тэмпературнага рэжыму. Крыху парушыш тэхналогію — і ўсё: далікатныя і прыгожыя бутоны панікнуць. Я заўсёды кажу, што кветкі — як дзеці. Да іх трэба ставіцца з любоўю.*

Але ўласная сям'я ніколі не адыходзіла для нашай гераіні на другі план.

*— У нас сямейны бізнес. Без падтрымкі і разумення родных мне было б складана. Цяпер у кветкавым бізнесе мне дапамагае дачка, яна скончыла ўніверсітэт і ўзяла на сябе значны аб'ём работы ў краме. Сын таксама заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу. А ў мяне з'явілася магчымасць займацца ўласным хобі, рэалізоўваць планы і задумы.*

Ініцыятыўнасці нашай гераіні можна толькі пазайздросціць. Пэўны час яна была дэпутатам Слаўгарадскага раённага Савета дэпутатаў. Цяпер жа Наталля Алегаўна рэалізоўвае сябе ў аграэкатурызме. Некалькі гадоў яна наведвала трэнінгі і семінары па развіцці турыстычнага кірунку ў Слаўгарадскім раёне. А пасля адчула, што можа паспрабаваць сябе і ў гэтай справе. Тым больш што ў вольны час сям'я Шэндзеравых любіць падарожнічаць. А значыць, добра разумее, што трэба сучаснаму турысту.

*— У пэўны момант я зразумела, што ўсё складваецца. Ёсць магчымасць заняцца аграэкатурызмам. Так з'явілася мая справа для душы — аграсядзіба «Свет кветак». Сёння мы развіваемся і павялічваем патэнцыял. І цяпер ужо наша аграсядзіба стала пляцоўкай для правядзення трэнінгаў і семінараў. Мы прапаноўваем таксама банкетную залу для правядзення мерапрыемстваў.*

Слаўгарадскі раён прывабліве турыстаў нешматлікімі, але ўнікальнымі турыстычнымі аб'ектамі: помнікам прыроды «Блакітная крыніца», на якім штогод ладзіцца свята Макаўе, а таксама музеем і капліцай на месцы бітвы пад Лясной. Таму аграсядзіба сям'і Шэндзеравых карыстаецца попытам і не пустое.

*— Пандэмія ўнесла свае карэктывы. Мы вымушаныя падладжвацца пад новыя ўмовы, якія дыктуе свет. Але мы не спыняемся, за апошні год актыўна пачалі развіваць сацыяльныя сеткі і дастаўку кветак дадому. Пашыраем тэрыторыю: дастаўляем кветкі па Слаўгарадскім і двух суседніх раёнах. На функцыянаванні аграсядзібы эпідэмічная сітуацыя таксама адбілася. Цяпер да нас прыязджае менш замежных турыстаў, затое актывізаваліся беларусы.*

З нашай гераіняй мы сустрэліся ў аграсядзібе «Свет кветак», каб убачыць гонар сям'і Шэндзеравых на ўласныя вочы. А ў канцы гутаркі мы спыталі ў Наталлі Алегаўны, якое дасягненне яна лічыць галоўным у сваім жыцці.

*— Я рэалізавалася як маці, як бізнес-лэдзі. Сёння ў мяне шмат планаў і ідэй, але я адчуваю — я сапраўды раблю тое, што падабаецца. Я ўсё жыццё дзяліла сябе пароўну. Ніколі мае дзеці не адчувалі недахопу любові, як і мая справа ніколі не была мною забытая. Я ўсюды трымаю баланс і ўсюды атрымліваю вынік. І менавіта гэты баланс і ёсць маё галоўнае дасягненне.*

**Алёна КУХАРАВА,**
*Слаўгарадскі раён.*

# САПРАЎДНЫ БАЕЦ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Сёння ў яе паслужным спісе — звыш 350 гадзін нясення службы. Месца работы — каскад азёраў у мікрараёне Валатава Чыгуначнага раёна Гомеля. На змене — дзевяць гадзін два дні запар, потым адзін выхадны. Сочыць за работай байцоў на дзяжурстве дасведчаны ратавальнік, старшына ратавальнага паста і кіраўнік Гомельскай цэнтральнай раённай арганізацыі Таварыства ратавання на вадзе Мікалай Раманаў. Работа, вядома, напружаная фізічна (рэжым дзяжурства на вадаёмах прыходзіцца і на «гарачыя» гадзіны пік), але і вельмі складаная маральна. Вытрымае не кожны хлопец, не тое што дзяўчына. Але скідка на слабы пол — гэта не пра Хрысціну. Яна — студэнтка факультэта фізічнай культуры ГДУ імя Ф. Скарыны, перайшла на трэці курс. З дзяцінства займалася рознымі відамі спорту. Давялося ёй паспрабаваць сябе ў рабоце з дзецьмі ў секцыі па таэквандо, якім некалі займалася. Добра плавае з ранняга дзяцінства. Удасканальваць спартыўныя навыкі працягвае і на занятках у басейне. Яшчэ на першым курсе Хрысціна загарэлася ідэяй трапіць у падраздзяленне студэнцкага атрада матросаў-ратавальнікаў.

— Мне расказалі, што дзяўчат там няма, але, вядома ж, мяне гэта не спыніла. Хутчэй, нават наадварот — вырашыла, што стану першай. Сёлета запісалася загадзя, калі атрад толькі фарміраваўся, і мяне ўзялі, — кажа студэнтка. Адзначае, што яе родныя таксама падтрымалі рашэнне ўступіць у рады ратавальнікаў на вадзе. Дарэчы, бацька Хрысціны — афіцэр МНС, узначальвае Гомельскі гарадскі аддзел па надзвычайных сітуацыях.

— Мабыць, жаданне прыносіць карысць і дапамагаць людзям перадалося мне ад таты. Ён, вядома ж, падтрымаў маё ўступленне ў атрад, кажа, што мы практычна калегі, і ганарыцца мною. Гэта вельмі прыемна, — дадае дзяўчына.

Для яе галоўнае, што новы вопыт дае магчымасць адчуць ступень адказнасці за іншых людзей, нясе і пачуццё ўпэўненасці, што ў экстраннай сітуацыі яна не разгубіцца.

Перад тым як выйсці на работу, Хрысціна вытрымала курс спецыяльнай падрыхтоўкі. Як і ўсе байцы, здавала плаванне, уменне трымацца на вадзе, ныраць, кіраваць лодкай. Экзамен прымалі ратавальнікі абласной арганізацыі Таварыства ратавання на вадзе.

— Нашаму атраду прыходзіцца быць напагатове і на сушы, і на вадзе. Адзін чалавек патрулюе з лодкі на працягу дзвюх гадзін, другі — кантралюе сітуацыю з берага, затым змяняемся, — тлумачыць ратавальніца. — Пачынаецца змена з абавязковага інструктажу па тэхніцы бяспекі. Пад кіраўніцтвам старшыны ратавальнага паста загружаем лодку выратавальным рыштункам і прыступае да нясення службы, — ужо па-вайсковаму рапартуе дзяўчына.

Старшына ратавальнага паста на каскадзе азёраў у мікрараёне Валатава, старшыня Гомельскай цэнтральнай раённай арганізацыі Таварыства ратавання на вадзе Мікалай Раманаў кажа, што без перабольшання сёлета падабралася вельмі моцная каманда адказных і ўважлівых матросаў-ратавальнікаў з ліку байцоў студэнцкага атрада.

— Гэтыя маладыя людзі адважыліся на высакародную місію. Яны вельмі смелыя, бо не кожны вырашыцца несці адказнасць за жыцці іншых, выпрабоўваць свае сілы і нервы, каб быць на варце чалавечага жыцця. Гэта спартыўныя, падрыхтаваныя маладыя людзі, плыўцы, весляры, прадстаўнікі воднага пола, кандыдаты ў майстры спорту. Яны фізічна вельмі моцныя, — дадаў Мікалай Раманаў.

Дасведчаны ратавальнік падкрэслівае: не менш важны навык, які адточваеца ў падобнай рабоце — гэта ўменне пераконваць людзей выконваць правілы бяспекі. Нават тых, хто настроены агрэсіўна і паводзіць сябе неадэкватна. Маладую змену тут вучаць усім тонкасцям і асаблівасцям нясення службы на вадзе, нацэльваюць на работу на апярэджанне, бо важна пагаварыць з людзьмі, растлумачыць рызыкі, прадухіліць парушэнні.

— Нагрузка тут немалая. У зоне ўвагі могуць знаходзіцца сотні людзей. Акцэнт робім на недапушчэнні трагічных выпадкаў. Толькі ў мінулым месяцы выпісалі 10 папярэджанняў, а вусных, вядома, значна больш. Для большай эфектыўнасці службы ў летні перыяд варта павялічваць колькасць ратавальнікаў, — лічыць Мікалай Раманаў.

Між тым байцы студэнцкага атрада матросаў-ратавальнікаў, якія былі сёлета адабраныя для службы, — добрая падмога ў рабоце супрацоўнікаў ратавальных станцый. Вядома, у гарачыя летнія месяцы на вадаёмах павялічваецца колькасць адпачывальнікаў, рэжым нясення службы ратавальнікаў на вадзе напружаны. Таму ініцыятыва БРСМ па стварэнні студатрадаў байцоў-ратавальнікаў — вельмі актуальная. Увогуле падобныя атрады фарміруюцца на Гомельшчыне трэці год запар. Гэта першая такая практыка ў нашай краіне і абсалютна новая для краіны летняя форма занятасці маладых людзей. Сёлета да работы матросаў-ратавальнікаў прыступілі пятнаццаць студэнтаў. Як будзе развівацца дадзеная ініцыятыва моладзі ў наступным годзе і ці пяройдуць прыклад Гомельшчыны іншыя рэгіёны, пакажа час.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Гомельскай абласной арганізацыі БРСМ.**

Закон

# Аб змене законаў па пытаннях абароны

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў* *25 чэрвеня 2021 г.*
*Адобраны Саветам Рэспублікі* *25 чэрвеня 2021 г.*

**Артыкул 1. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 лістапада 1992 г. № 1904-XII «Аб Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь» наступныя змяненні:**

1. У прэамбуле словы «Рэспублікі Беларусь, ваенізаванымі арганізацыямі Рэспублікі Беларусь (далей — ваенізаваныя арганізацыі)» замяніць словамі «, ваенізаванымі арганізацыямі».

2. У артыкуле 1:

у абзацы трэцім:

словы «Рэспублікі Беларусь (далей — іншыя войскі і воінскія фарміраванні)» выключыць;

словы «войскі Рэспублікі Беларусь», «спраў Рэспублікі Беларусь», «бяспекі Рэспублікі Беларусь», «службы Рэспублікі Беларусь» і «заканадаўствам Рэспублікі Беларусь» замяніць адпаведна словамі «войскі», «спраў», «бяспекі», «службы» і «заканадаўствам»;

у абзацы чацвёртым:

словы «Рэспублікі Беларусь (далей — Міністэрства абароны)» выключыць;

словы «спраў Рэспублікі Беларусь», «бяспекі Рэспублікі Беларусь» і «камітэт Рэспублікі Беларусь» замяніць адпаведна словамі «спраў», «бяспекі» і «камітэт».

3. У частцы першай артыкула 2 словы «актах Рэспублікі Беларусь» замяніць словам «актах».

4. З абзаца шостага артыкула 6, часткі другой артыкула 7, артыкула 13, часткі другой артыкула 14, артыкулаў 15 і 18 словы «Рэспублікі Беларусь» выключыць.

5. У частцы другой артыкула 9 словы «абароны Рэспублікі Беларусь» замяніць словам «абароны».

6. У частцы другой артыкула 10 словы «заканадаўствам Рэспублікі Беларусь» замяніць словам «заканадаўствам».

7. Артыкул 11 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 11. Прыцягненне Узброеных Сіл для вырашэння задач у складзе дзяржаўнай сістэмы рэагавання на акты тэрарызму, дзейнасць тэрарыстычных арганізацый, незаконных узброеных фарміраванняў і масавыя беспарадкі**

У выключных выпадках у складзе дзяржаўнай сістэмы рэагавання на акты тэрарызму, дзейнасць тэрарыстычных арганізацый, незаконных узброеных фарміраванняў і масавыя беспарадкі Узброеныя Сілы могуць прыцягвацца для вырашэння наступных задач:

барацьба з тэрарызмам;

ахова крытычна важных аб'ектаў;

ахова грамадскага парадку, забеспячэнне грамадскай бяспекі, спыненне масавых беспарадкаў;

забеспячэнне бяспекі ахоўных асоб і ахоўных аб'ектаў.

Узброеныя Сілы могуць прыцягвацца для абароны насельніцтва і аказання яму дапамогі ў складзе сіл дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый у адпаведнасці з заканадаўствам, а таксама ў іншых выпадках, устаноўленых заканадаўчымі актамі.

Рашэнне задач, указаных у абзацах трэцім—пятым часткі першай гэтага артыкула, ажыццяўляецца сіламі і сродкамі Узброеных Сіл пасля перадачы іх у аператыўнае падпарадкаванне органаў кіравання іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў, ваенізаваных арганізацый. Парадак такой перадачы ўстанаўліваецца заканадаўствам.

Пры вырашэнні задач, указаных у гэтым артыкуле, на ваеннаслужачых Узброеных Сіл распаўсюджваюцца палажэнні заканадаўства аб унутраных войсках Міністэрства ўнутраных спраў у частцы, якая датычыцца ўмоў, парадку і меж прымянення фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў, зброі, баявой і спецыяльнай тэхнікі, гарантый прававой і сацыяльнай абароны, асабістай бяспекі ваеннаслужачых і членаў іх сем'яў.».

8. Артыкул 11[1] выключыць.

9. У артыкуле 12 словы «актамі Рэспублікі Беларусь» замяніць словам «актамі».

**Артыкул 2.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 24 чэрвеня 2002 г. № 117-З «Аб надзвычайным становішчы» наступныя змяненні:

1. Артыкул 1 пасля слова «далей» дапоўніць словамі «, калі не прадугледжана іншае,».

2. Артыкул 3 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 3. Падставы для ўвядзення надзвычайнага становішча**

Надзвычайнае становішча можа ўводзіцца пры наяўнасці абставін, якія ўяўляюць непасрэдную пагрозу бяспецы жыцця і здароўя людзей, тэрытарыяльнай цэласнасці і існаванню дзяржавы, ліквідацыя якіх немагчыма без прымянення надзвычайных мер. Да такіх абставін адносяцца:

надзвычайныя сітуацыі прыроднага і тэхнагеннага характару, у тым ліку эпідэміі і эпізаатыі, якія прывялі (якія могуць прывесці) да чалавечых ахвяр, нанясення ўрону здароўю людзей і навакольнаму прыроднаму асяроддзю, значных матэрыяльных страт і парушэння ўмоў жыццядзейнасці насельніцтва (далей — надзвычайныя сітуацыі);

беспарадкі, якія суправаджаюцца гвалтам ці пагрозай гвалту з боку групы асоб і арганізацый, у выніку якіх узнікае небяспека для жыцця і здароўя людзей, тэрытарыяльнай цэласнасці і існавання дзяржавы (спробы гвалтоўнага змянення канстытуцыйнага ладу, захопу ці ўтрымання дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам, узброены мяцеж, масавыя беспарадкі, міжнацыянальныя і міжканфесійныя канфлікты, якія суправаджаюцца гвалтоўнымі дзеяннямі, што ствараюць непасрэдную пагрозу бяспецы жыцця і здароўя людзей).».

3. Дапоўніць Закон артыкулам 4[1] наступнага зместу:

**«Артыкул 4[1]. Увядзенне надзвычайнага становішча ў асаблівых абставінах**

У выпадку гібелі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у выніку замаху на яго жыццё, здзяйсненні акта тэрарызму, знешняй агрэсіі, з прычыны іншых дзеянняў гвалтоўнага характару неадкладна на падставе рашэння Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь на ўстаноўленым парадку на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь уводзіцца надзвычайнае становішча (калі не прынята рашэнне аб увядзенні ваеннага становішча).

У абставінах, указаных у частцы першай гэтага артыкула:

на пасяджэннях Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь старшынствуе Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь;

пры разглядзе пытанняў, звязаных з правядзеннем выбараў, у пасяджэннях Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь удзельнічаюць старшыні абласных, Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў з правам голасу;

дзяржаўныя органы, іх службовыя асобы дзейнічаюць у адпаведнасці з рашэннямі Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь;

Саветам Бяспекі Рэспублікі Беларусь вызначаецца пералік надзвычайных мер і часовых абмежаванняў (прыпыненняў), якія падлягаюць прымяненню і прадугледжаны часткай першай артыкула 11 і часткай першай артыкула 13 гэтага Закона.

Рашэнні Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь па рэалізацыі паўнамоцтваў, прадугледжаных часткамі першай і другой гэтага артыкула:

абавязковыя для ўсіх дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, службовых асоб і грамадзян;

падлягаюць неадкладнаму выкананню;

прымаюцца шляхам тайнага галасавання большасцю галасоў пастаянных членаў Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь, але не менш чым дзвюма трэцямі галасоў ад іх агульнай колькасці.

У выпадку невыканання або неналежнага выканання кіраўнікамі дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, іншымі службовымі асобамі рашэнняў Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь дадзены дзяржаўны орган мае права:

вызваляць такіх асоб ад пасады;

прызначаць на адпаведную пасаду іншых асоб.».

4. У назве главы 3 слова «(прыпыненне)» замяніць словам «(прыпыненне)».

5. Артыкул 11 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 11. Надзвычайныя меры і часовыя абмежаванні (прыпыненні), якія прымяняюцца пры ўвядзенні надзвычайнага становішча**

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб увядзенні надзвычайнага становішча на тэрмін дзеяння надзвычайнага становішча могуць быць прадугледжаны наступныя надзвычайныя меры і часовыя абмежаванні (прыпыненні):

поўнае або частковае прыпыненне на тэрыторыі, на якой уведзена надзвычайнае становішча, паўнамоцтваў асобных дзяржаўных органаў і дзяржаўных арганізацый, калі іншае не ўстаноўлена Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь;

увядзенне каменданцкай гадзіны, гэта значыць забароны ва ўстаноўлены час сутак знаходзіцца на вуліцах і ў іншых грамадскіх месцах без спецыяльна выдадзеных пропускаў і (або) дакументаў, якія сведчаць асобу грамадзян;

устанаўленне абмежаванняў на свабоду перамяшчэння па тэрыторыі, на якой уведзена надзвычайнае становішча, а таксама ўвядзенне асобага рэжыму ўезду на ўказаную тэрыторыю і выезду з яе, уключаючы ўстанаўленне абмежаванняў на ўезд на ўказаную тэрыторыю і знаходжанне на ёй замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, абмежаванне руху транспартных сродкаў і ажыццяўленне іх надгляду;

узмацненне аховы грамадскага парадку, аб'ектаў, якія падлягаюць дзяржаўнай ахове, крытычна важных аб'ектаў;

устанаўленне абмежаванняў (забаронаў) вытворчасцяў і (або) рэалізацыі тавараў (работ, паслуг);

устанаўленне асобага парадку продажу, набыцця і размеркавання тавараў;

забарона або абмежаванне правядзення сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый і пікетавання;

адкладанне правядзення забастовак ці прыпыненне іх на тэрыторыі, на якой уведзена надзвычайнае становішча, але не больш чым на трохмесячны тэрмін;

прыпыненне дзейнасці крытычна важных аб'ектаў, віды якіх вызначаюцца ўказам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пры ўвядзенні надзвычайнага становішча;

прыпыненне (спыненне) выпуску сродкаў масавай інфармацыі, дзеяння пасведчанняў аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў, дзеяння ліцэнзій на ажыццяўленне паліграфічнай дзейнасці і дзейнасці ў галіне вяшчання;

абмежаванне доступу да інтэрнэт-рэсурсаў, сеткавых выданняў;

эвакуацыя матэрыяльных і гісторыка-культурных каштоўнасцяў у бяспечныя раёны ў выпадку, калі існуе рэальная пагроза іх знішчэння, выкрадання ці пашкоджання.

Парадак прымянення прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула надзвычайных мер і часовых абмежаванняў (прыпыненняў) з указаннем адказных за гэта дзяржаўных органаў устанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.».

6. У артыкуле 12: у абзацы першым слова «артыкуле» замяніць словамі «часткі першай артыкула»;

у абзацы шостым слова «восьмым» замяніць словамі «дзявятым часткі першай»;

дапоўніць артыкул часткай наступнага зместу:

«Парадак прымянення прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула надзвычайных мер і часовых абмежаванняў з указаннем адказных за гэта дзяржаўных органаў устанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.».

7. У артыкуле 13:

у назве артыкула слова «(прыпыненне)» замяніць словам «(прыпынення)»;

у абзацы першым словы «абмежаваннем (прыпыненне)», «артыкуле» і «абмежаванні (прыпыненне)» замяніць адпаведна словамі «абмежаваннем (прыпыненнем)», «часткі першай артыкула» і «абмежаванні (прыпыненні)»;

абзац другі выключыць;

абзац трэці выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«абмежаванне свабоды сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку шляхам прыпынення дзейнасці па распаўсюджванні прадукцыі тэлевізійных, радыёвяшчальных і друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, прыпынення дзеяння дазволаў на распаўсюджванне прадукцыі замежнага сродку масавай інфармацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь без змянення формы або зместу, а таксама ўстанаўленне асобага парадку акрэдытацыі журналістаў і парадку ўвядзення цэнзуры;»;

абзац шосты пасля слоў «выбуховых рэчываў,» дапоўніць словамі «піратэхнічных сродкаў,»;

дапоўніць артыкул абзацам наступнага зместу:

«выкарыстанне матэрыяльных каштоўнасцяў дзяржаўнага і (або) мабілізацыйнага матэрыяльных рэзерваў.»;

дапоўніць артыкул часткай наступнага зместу:

«Парадак прымянення прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула надзвычайных мер і часовых абмежаванняў (прыпыненняў) з указаннем адказных за гэта дзяржаўных органаў устанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.».

8. Дапоўніць Закон артыкулам 13[1] наступнага зместу:

**«Артыкул 13[1]. Падрыхтоўчыя мерапрыемствы да рэалізацыі надзвычайных мер і часовых абмежаванняў (прыпыненняў)**

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы загадзя распрацоўваюць планы падрыхтоўкі да ўвядзення надзвычайнага становішча і забеспячэння яго рэжыму на адпаведных тэрыторыях.».

9. Артыкулы 16 і 17 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 16. Сілы і сродкі для забеспячэння рэжыму надзвычайнага становішча**

Для забеспячэння рэжыму надзвычайнага становішча выкарыстоўваюцца сілы і сродкі органаў унутраных спраў, органаў дзяржаўнай бяспекі, унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў (далей — унутраныя войскі ), а пры ўвядзенні надзвычайнага становішча па падставах, названых у абзацы другім артыкула 3 гэтага Закона, — таксама органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях.

**Артыкул 17. Прыцягненне дадатковых сіл і сродкаў для забеспячэння рэжыму надзвычайнага становішча**

У дадатак да сіл і сродкаў, указаных у артыкуле 16 гэтага Закона, для забеспячэння рэжыму надзвычайнага становішча па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь могуць прыцягвацца Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь, іншыя войскі, воінскія фарміраванні і ваенізаваныя арганізацыі.

Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь, іншыя войскі, воінскія фарміраванні і ваенізаваныя арганізацыі (за выключэннем органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях) прыцягваюцца для вырашэння наступных задач:

папярэджанне і спыненне беспарадкаў, указаных у абзацы трэцім артыкула 3 гэтага Закона, забеспячэнне аховы грамадскага парадку і грамадскай бяспекі;

падтрыманне асобага рэжыму ўезду на тэрыторыю, на якой уведзена надзвычайнае становішча, і выезду з яе;

ахова крытычна важных аб'ектаў, іншых аб'ектаў і тэрыторый;

забеспячэнне бяспекі асоб і аб'ектаў, якія падлягаюць дзяржаўнай ахове;

удзел у ліквідацыі надзвычайных сітуацый і выратаванні жыцця людзей у складзе сіл дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый.

Органы і падраздзяленні па надзвычайных сітуацыях прыцягваюцца для вырашэння задач, ускладзеных на іх заканадаўчымі актамі, а ў выпадку ўвядзення надзвычайнага становішча па падставах, названых у абзацы трэцім

# Рэспублікі Беларусь суверэнітэту і канстытуцыйнага ладу

артыкула 3 гэтага Закона, — таксама для аховы крытычна важных аб'ектаў і спынення беспарадкаў.

Задачы, прадугледжаныя гэтым артыкулам (за выключэннем задачы, названай у абзацы трэцім часткі другой), ваеннаслужачыя Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў, супрацоўнікі (работнікі) ваенізаваных арганізацый вырашаюць сумесна з супрацоўнікамі органаў унутраных спраў, органаў дзяржаўнай бяспекі і ваеннаслужачымі ўнутраных войскаў.

Пры вырашэнні задач, прадугледжаных гэтым артыкулам:

на ваеннаслужачых Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў распаўсюджваюцца палажэнні заканадаўства аб унутраных войсках у частцы, якая датычыцца ўмоў, парадку і межаў прымянення фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў, зброі, баявой і спецыяльнай тэхнікі, гарантый прававой і сацыяльнай абароны, асабістай бяспекі ваеннаслужачых і членаў іх сем'яў;

на супрацоўнікаў (работнікаў) ваенізаваных арганізацый распаўсюджваюцца палажэнні заканадаўства аб органах унутраных спраў у частцы, якая датычыцца ўмоў, парадку і межаў прымянення фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў, зброі, гарантый прававой і сацыяльнай абароны, асабістай бяспекі супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, членаў іх сем'яў і блізкіх.».

10. У артыкуле 18:

у частцы другой:

абзац першы дапоўніць словамі «, калі іншае не ўстаноўлена Урадам Рэспублікі Беларусь»;

у абзацы другім словы «воінскіх фарміраванняў» замяніць словамі «іншых войскаў, воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый»;

у абзацы шостым слова «шостым» замяніць словамі «пятым часткі першай»;

у абзацы восьмым словы «(прыпынення)» і «артыкуламі 11 — » замяніць адпаведна словамі «(прыпыненняў)» і «часткай першай артыкула 11, часткай першай артыкула 12 і часткай першай артыкула»;

дапоўніць частку абзацамі наступнага зместу:

«вызначае парадак увядзення цэнзуры і ўмовы яе ажыццяўлення;

устанаўлівае пералік крытычна важных аб'ектаў, іншых аб'ектаў і тэрыторый, на якіх узмацняецца ахова;

устанаўлівае пералік крытычна важных аб'ектаў, дзейнасць якіх падлягае прыпыненню;

устанаўлівае пералік вытворчасцяў і (або) рэалізацыі тавараў (работ, паслуг), якія падлягаюць абмежаванням (забаронам);

устанаўлівае асобы парадак продажу, набыцця і размеркавання тавараў;

выкарыстоўвае матэрыяльныя каштоўнасці дзяржаўнага і (або) мабілізацыйнага матэрыяльных рэзерваў, мабілізуе рэсурсы арганізацый, змяняе рэжым іх работы, пераарыентуе арганізацыі на вытворчасць неабходнай ва ўмовах надзвычайнага становішча прадукцыі і ўстанаўлівае іншыя неабходныя ва ўмовах надзвычайнага становішча змяненні вытворча-гаспадарчай дзейнасці.»;

з часткі трэцяй словы «Рэспублікі Беларусь» выключыць.

11. Дапоўніць Закон артыкулам 19[1] наступнага зместу:

**«Артыкул 19[1]. Дзяржаўная сістэма рэагавання на акты тэрарызму, дзейнасць тэрарыстычных арганізацый, незаконных узброеных фарміраванняў і масавыя беспарадкі**

У мэтах папярэджання ўзнікнення і ліквідацыі падстаў для ўвядзення надзвычайнага становішча, указаных у абзацы трэцім артыкула 3 гэтага Закона, задзейнічаецца дзяржаўная сістэма рэагавання на акты тэрарызму, дзейнасць тэрарыстычных арганізацый, незаконных узброеных фарміраванняў і масавыя беспарадкі (далей — дзяржаўная сістэма рэагавання).

Да суб'ектаў дзяржаўнай сістэмы рэагавання адносяцца дзяржаўныя органы і іншыя дзяржаўныя арганізацыі, якія з'яўляюцца суб'ектамі процідзеяння экстрэмізму і барацьбы з тэрарызмам.

Дзяржаўныя органы і іншыя дзяржаўныя арганізацыі, якія не з'яўляюцца суб'ектамі процідзеяння экстрэмізму і барацьбы з тэрарызмам, удзельнічаюць у рэалізацыі задач дзяржаўнай сістэмы рэагавання ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй.

Парадак функцыянавання дзяржаўнай сістэмы рэагавання вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.».

12. У артыкуле 20:

у назве артыкула словы «і воінскіх фарміраванняў» замяніць словамі «, воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый»;

у тэксце артыкула словы «і воінскія фарміраванні» замяніць словамі «, воінскія фарміраванні і ваенізаваныя арганізацыі».

13. У частцы першай артыкула 21 словы «і воінскіх фарміраванняў» і «заканадаўствам Рэспублікі Беларусь» замяніць адпаведна словамі «, воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый» і «заканадаўствам».

14. Артыкул 22 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 22. Фінансаванне мер па забеспячэнні рэжыму надзвычайнага становішча, а таксама работ па ліквідацыі наступстваў надзвычайнага становішча і абставін, якія паслужылі падставай для яго ўвядзення**

Фінансаванне мер па забеспячэнні рэжыму надзвычайнага становішча да зацвярджэння надзвычайнага бюджэту арганізуецца ў парадку, устаноўленым Урадам Рэспублікі Беларусь.

Аб'ёмы матэрыяльных каштоўнасцяў дзяржаўнага і (або) мабілізацыйнага матэрыяльных рэзерваў, якія выкарыстоўваюцца, памеры і парадак фінансавання і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння работ па ліквідацыі наступстваў надзвычайнага становішча і абставін, якія паслужылі падставай для яго ўвядзення, у тым ліку парадак фінансавання сацыяльных выплат і кампенсацый за шкоду, прычыненую грамадзянам у выніку наступстваў надзвычайнага становішча і абставін, якія паслужылі падставай для яго ўвядзення, мерапрыемстваў па часовым адсяленні жыхароў у бяспечныя раёны ў сувязі з прымяненнем іншых мераў, прадугледжаных главой 3 гэтага Закона, а таксама парадак выплаты кампенсацый за шкоду, прычыненую арганізацыям у сувязі з прымяненнем мер, прадугледжаных главой 3 гэтага Закона, вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Фінансаванне мерапрыемстваў па ліквідацыі наступстваў надзвычайнага становішча праводзіцца за кошт сродкаў арганізацый, якія знаходзяцца на тэрыторыі, на якой уведзена надзвычайнае становішча, сродкаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, адпаведных бюджэтаў і іншых крыніц. Пры адсутнасці або недастатковасці названых сродкаў для ліквідацыі наступстваў надзвычайнага становішча да зацвярджэння надзвычайнага бюджэту выдзяляюцца сродкі з рэспубліканскага бюджэту.

Па рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь у працэсе выканання рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў уносяцца змены ў асобныя расходы рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў па адпаведнай класіфікацыі расходаў бюджэту для рэалізацыі мерапрыемстваў і надзвычайных мер у межах зацверджаных гадавых сум расходаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.

Пералік асобных расходаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, якія падлягаюць перараз мяркаванню ў адпаведнасці з часткай чацвёртай гэтага артыкула, зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Удакладненыя расходы рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў ўлічваюцца пры фарміраванні надзвычайнага бюджэту ва ўмовах надзвычайнага становішча або пры выданні заканадаўчага акта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб удакладненні асобных паказчыкаў рэспубліканскага бюджэту на адпаведны фінансавы год.».

15. У артыкуле 23:

у назве артыкула слова «(прыпынення)» замяніць словам «(прыпыненняў)»;

у частцы першай словы «заканадаўствам Рэспублікі Беларусь» замяніць словам «заканадаўствам».

16. У артыкуле 24:

у частцы першай:

пасля слова «сёмым» дапоўніць частку словамі «часткі першай»;

словы «Рэспублікі Беларусь» выключыць;

частку трэцюю пасля слова «чацвёртым» дапоўніць словамі «часткі першай».

17. З артыкулаў 25 і 27, частцы другой артыкула 30 словы «Рэспублікі Беларусь» выключыць.

18. У артыкуле 26:

у частцы першай словы «другім артыкула 13» замяніць словамі «трэцім часткі першай артыкула 11»;

у частцы трэцяй слова «сёмым» замяніць словамі «шостым часткі першай».

19. У частцы першай артыкула 28 словы «акты Рэспублікі Беларусь» замяніць словам «акты».

20. У артыкуле 29 словы «і воінскіх фарміраванняў» і «актамі Рэспублікі Беларусь» замяніць адпаведна словамі «, воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый» і «актамі».

21. У артыкуле 31:

з часткі першай словы «Рэспублікі Беларусь» выключыць;

у частцы другой словы «пракурорам Рэспублікі Беларусь» замяніць словам «пракурорам».

**Артыкул 3.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 студзеня 2003 г. № 185-З «Аб ваенным становішчы» наступныя змяненні:

1. У частцы першай артыкула 2 словы «у тым ліку» замяніць словамі «а таксама».

2. Абзац чацвёрты часткі трэцяй артыкула 4 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«узброенае ўздзеянне іншай дзяржавы (кааліцыі дзяржаў) на Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь (далей — Узброеныя Сілы), іншыя войскі і воінскія фарміраванні;».

3. Дапоўніць Закон артыкулам 5[1] наступнага зместу:

**«Артыкул 5[1]. Увядзенне ваеннага становішча ў асобых абставінах**

У выпадку гібелі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у выніку замаху на яго жыццё, здзяйснення акта тэрарызму, знешняй агрэсіі, з прычыны іншых дзеянняў гвалтоўнага характару неадкладна на падставе рашэння Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь ва ўстаноўленым парадку на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь уводзіцца ваеннае становішча (калі не прынята рашэнне аб увядзенні надзвычайнага становішча).

У абставінах, указаных у частцы першай гэтага артыкула:

на пасяджэннях Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь старшынствуе Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь;

дзяржаўныя органы, іх службовыя асобы дзейнічаюць у адпаведнасці з рашэннямі Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь;

Саветам Бяспекі Рэспублікі Беларусь вызначаецца пералік мер, якія падлягаюць прымяненню, па забеспячэнні ваеннага становішча ў адпаведнасці з артыкулам 15 гэтага Закона.

Рашэнні Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь па рэалізацыі паўнамоцтваў, прадугледжаных часткамі першай і другой гэтага артыкула:

абавязковыя для ўсіх дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, службовых асоб і грамадзян;

падлягаюць неадкладнаму выкананню;

прымаюцца шляхам тайнага галасавання большасцю галасоў пастаянных членаў Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь, але не менш чым дзвюма трэцямі галасоў ад іх агульнай колькасці.

У выпадку невыканання або неналежнага выканання кіраўнікамі дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, іншымі службовымі асобамі рашэнняў Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь дадзены дзяржаўны орган мае права:

вызваляць такіх асоб ад пасады;

прызначаць на адпаведную пасаду іншых асоб.».

4. З частак другой і трэцяй артыкула 7, артыкула 16, абзаца чатырнаццатага часткі першай артыкула 17, назвы і абзаца першага часткі першай артыкула 28, назвы, абзацаў першага, сёмага, восьмага і дзясятага часткі першай, абзаца першага часткі другой артыкула 29, назвы, абзацаў першага і сёмага часткі першай, абзаца першага часткі другой артыкула 30, назвы і абзаца першага артыкула 31, назвы, абзацаў першага і пятага часткі першай, абзацаў першага і шостага часткі другой артыкула 32, назвы і абзаца першага часткі першай артыкула 33, назвы , абзацаў першага і пятага артыкула 34, назвы і абзаца першага артыкула 35, назвы і абзаца першага артыкула 36, назвы і абзаца першага артыкула 37, назвы і абзаца першага артыкула 38, назвы і абзаца першага артыкула 39, назвы, абзацаў першага і чацвёртага артыкула 40, назвы, абзацаў першага, шостага і сёмага артыкула 41, назвы, абзацаў першага і трэцяга артыкула 42, назвы і абзаца першага артыкула 43, назвы і абзаца першага артыкула 44, назвы і абзаца першага артыкула 46, назвы і абзаца першага артыкула 47, назвы, абзацаў першага і трэцяга артыкула 48, часткі пятай артыкула 50 і часткі другой артыкула 51 словы «Рэспублікі Беларусь» выключыць.

5. У частцы пятай артыкула 11 словы «бяспекі Рэспублікі Беларусь» замяніць словам «бяспекі».

6. У частцы першай артыкула 15:

у абзацах трыццаць чацвёртым і трыццаць дзявятым словы «замежных сродкаў масавай інфармацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» замяніць словамі «замежнага сродку масавай інфармацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь без змены формы або зместу»;

у абзацы трыццаць пятым словы «інфармацыі Рэспублікі Беларусь» замяніць словам «інфармацыі»;

у абзацы трыццаць шостым:

словы «выдаўцоў, вытворцаў і распаўсюджвальнікаў» замяніць словамі «выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка»;

словы «Рэспублікі Беларусь» выключыць;

у абзацы трыццаць сёмым словы «сродкаў» і «выдаўцоў, вытворцаў і распаўсюджвальнікаў» замяніць адпаведна словамі «сродку» і «выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка».

7. Абзац шосты артыкула 26 пасля слоў «адпаведнасці з» дапоўніць словамі «гэтым Законам і іншымі».

8. У артыкуле 45:

з назвы артыкула і абзаца першага словы «Рэспублікі Беларусь» выключыць;

у абзацы пятым словы «замежных сродкаў масавай інфармацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» замяніць словамі «замежнага сродку масавай інфармацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь без змены формы або зместу»;

у абзацы шостым словы «выдаўцоў, вытворцаў і распаўсюджвальнікаў», «рэгістрацыі сродкаў» і «на распаўсюджванне прадукцыі замежных сродкаў масавай інфармацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» замяніць адпаведна словамі «выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка», «рэгістрацыі сродку» і «на распаўсюджванне прадукцыі замежнага сродку масавай інфармацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь без змены формы або зместу».

**Артыкул 4.** Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін прыняць меры па рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

**Артыкул 5.** Гэты Закон уступае ў сілу ў наступным парадку:

артыкулы 1—3 — праз тры месяцы пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона;

іншыя палажэнні — пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

*14 ліпеня 2021 г., г. Мінск*
*№ 117-З*

Скажыце, доктар...

# АДКЛАДЗЕНЫ СТАРТ

## Якая фізічная нагрузка карысная для пажылых?

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

**Весці актыўны спосаб жыцця і пазбаўляцца ад хвароб не толькі з дапамогай таблетак, але і праз спорт, можна ў любым узросце. Рухальная актыўнасць у пажылым узросце — якраз тое, што падаўжае жыццё і ўмацоўвае здароўе. Разабрацца ў тым, якая павінна быць фізічная актыўнасць пасля 65 гадоў, якія хранічныя захворванні для яе — не перашкода, а ў якіх выпадках лепш спыніць трэніроўкі, дапамагла ўрач-герыятр герыятрычнага кабінета 11-й гарадской паліклінікі Ірына ІГОЛКА.**

***— Ірына Уладзіміраўна, чым карысная фізічная актыўнасць для пажылых людзей?***

— Гэта асноўны кампанент не толькі здаровага спосабу жыцця, але і лячэння і прафілактыкі шматлікіх захворванняў. Для людзей старэйшага ўзросту фізічная актыўнасць карысная не менш, чым для маладых. Актыўныя пажылыя людзі маюць больш высокі ўзровень функцыянальнай адаптацыі сардэчна-сасудзістай, дыхальнай сістэм, лепшую памяць, разумовую працаздольнасць, каардынацыю, меншую рызыку падзенняў, большую самастойнасць і больш нізкія паказчыкі смяротнасці з усіх прычын. Яна нармалізуе абменныя працэсы, дапамагае падтрымліваць аптымальную вагу цела, садзейнічае павелічэнню лёгачнай вентыляцыі, больш хуткай адаптацыі да ўмоў надвор'я.

Акрамя таго, рэгулярныя трэніроўкі дапамагаюць вылечыцца ад дэпрэсіі, а групавыя заняткі пазбаўляюць ад адчування сацыяльнай ізаляцыі і адзіноты. Трэба сказаць, што хранічныя захворванні не з'яўляюцца супрацьпаказаннем да ўмераных фізічных нагрузак.

***— Якая мусіць быць фізічная актыўнасць у пажылых?***

— Гэта не толькі спорт, але і любая штодзённая дзейнасць — хада, дамашняя работа, танцы і іншае. Але фізічная актыўнасць павінна быць рэгулярная — не менш за тры-пяць разоў на тыдзень. Неабходна падабраць такі від заняткаў, які будзе прыносіць задавальненне, — напрыклад, прагулка з сабакам, гульня з унукамі. Адразу трэба ўсведамляць, што не варта ставіць нерэальных задач і рэкордаў, абраны від фізічнай актыўнасці павінен быць даступны для вас. Пажадана, каб фізічная актыўнасць была аэробная (невысокай інтэнсіўнасці з выкарыстаннем вялікай колькасці кіслароду, — «**Зв.**»). Займацца лепш на свежым паветры або ў памяшканні, якое добра праветрываецца.

Фізічная актыўнасць умеранай інтэнсіўнасці павінна займаць не менш за 150 хвілін на тыдзень, высокай інтэнсіўнасці — не менш за 75 хвілін на тыдзень або спалучаць тую і другую. Трэба адразу сказаць, што пажылым людзям для заняткаў інтэнсіўнай фізічнай актыўнасцю неабходна дадатковае медыцынскае абследаванне. Паступова можна павялічыць фізічную актыўнасць сярэдняй інтэнсіўнасці да 300 хвілін на тыдзень, высокай інтэнсіўнасці — да 150 хвілін на тыдзень.

Для прадухілення падзенняў пажылым людзям я парэкамендавала б выконваць практыкаванні на раўнавагу тры і больш дзён на тыдзень. Для прафілактыкі астэапарозу і пераломаў рабіць сілавыя практыкаванні, дзе задзейнічаны асноўныя групы мышцаў, два і больш дзён на тыдзень.

Калі пажылы чалавек не здольны выконваць рэкамендаваны аб'ём фізічнай актыўнасці, можна рабіць практыкаванні, якія адпавядаюць магчымасцям і стану здароўя. У любым выпадку, нават невялікая рэгулярная фізічная актыўнасць — лепш, чым яе поўная адсутнасць.

***— Што яшчэ варта памятаць падчас заняткаў фізкультурай?***

— Піць дастатковую колькасць вады пасля і падчас заняткаў, каб пазбегнуць абязводжвання. Абавязкова разаграваць мышцы перад нагрузкай: прайсціся, выканаць некалькі нескладаных практыкаванняў да і пасля асноўнай нагрузкі. Абавязкова адводзіць час для шпацыраў і практыкаванняў на свежым паветры. Займацца ў зручным спартыўным абутку і адзенні. І не забываць пра важнасць правільнага харчавання.

***— Растлумачце, калі ласка, што такое ўмераная і інтэнсіўная фізічная актыўнасць для пажылых людзей.***

— Для людзей ва ўзросце 65 гадоў і старэйшых да ўмеранай фізічнай актыўнасці можна аднесці хаду, работу ў садзе ці агародзе, павольную язду на ровары, народныя, класічныя або папулярныя танцы, заняткі ёгай, настольны парны тэніс, хада па лесвіцы, плаванне, прыборку (мыццё вокнаў, падлог), практыкаванні на баланс, расцяжку або сілавыя практыкаванні з невялікай вагой.

Інтэнсіўная фізічная актыўнасць — гэта бег трушком, баскетбол, футбол, хуткая язда на ровары, хада на лыжах, адзіночны тэніс і бадмінтон, хуткае плаванне, сілавыя практыкаванні з вялікай вагой.

***— У якіх выпадках неабходна спыніць заняткі? Што сведчыць аб праблемах у арганізме?***

— Калі з'явіліся галавакружэнне, адчуванне «прыліву крыві» да твару, дыскамфорт або боль у вобласці сэрца, грудзей, моцная стома, болі ў ікраножных мышцах, аддышка, парушэнне каардынацыі, пасіненне канечнасцяў, калі перасягнута мяжа частаты сардэчных скарачэнняў, упаў або празмерна павысіўся артэрыяльны ціск, узніклі рэзкія болі ў суставах ці паясніцы. Калі сімптомы паўтараюцца, то тут, вядома, варта звяртацца да ўрача, каб параіцца і скарэктаваць нагрузку. Спыніць на пэўны час фізічныя заняткі неабходна, калі ў вас востры перыяд ці абвастрэнне хранічных захворванняў, абвастрэнне артрытаў, вострыя рэспіраторныя ці кішэчныя інфекцыі. Таксама калі ў спакоі частата сардэчных скарачэнняў большая за 100 ці меншая за 50 удараў у хвіліну, пры цяжкіх парушэннях рытму сэрца, калі ціск вышэйшы за 220/120 ці ніжэйшы 90/50 мм рт. сл. Пасля купіравання вострых станаў можна паступова вяртацца да звыклай фізічнай актыўнасці.

***— Ці можна займацца фізкультурай выпадкам з сардэчнымі захворваннямі, скажам, пасля інфаркту?***

— Для пацыентаў, што маюць захворванні сэрца, перанеслі інфаркт міякарда, прызначаецца праграма рэабілітацыі, якая ўключае курс кантраляванай урачом лячэбнай фізкультуры. Перад гэтым павінна быць праведзена абследаванне ў кабінеце функцыянальнай дыягностыкі для вызначэння «парогавай» частаты сардэчных скарачэнняў і частаты бяспечнага трэніровачнага пульсу. Максімальная ўзроставая частата сардэчных скарачэнняў вызначаецца па формуле: 220 удараў у хвіліну мінус узрост пацыента. Рэкамендуюцца нагрузкі з трэніровачным пульсам 50-75 % ад максімальнай частаты сардэчных скарачэнняў.

***— Калі ў пажылога чалавека баляць суставы, фізічныя нагрузкі таксама магчымыя?***

— Безумоўна. Суставы таксама павінны атрымліваць адэкватную нагрузку, але пачынаць заняткі неабходна з мінімальных нагрузак. У большасці выпадкаў фізічная актыўнасць не з'яўляецца прычынай узнікнення артрытаў або пагрозай для пашкоджання суставаў. Заняткі процілказаныя толькі ў перыяд абвастрэнняў артрытаў.

Атака з паветра

# КАЛІ ПАКУСАЛІ НАСЯКОМЫЯ...

**Кожны хоць бы раз у жыцці чуў байкі пра тое, як пчолы (восы, шэршні, чмялі) да паўсмерці закусалі каня, які не ўратаваўся ад праследавацеляў нават у рацэ. У медыцынскай літаратуры апісана, як людзі гінулі і ад 100–300 укусаў, аднак летальная доза для дарослага здаровага чалавека — 500–1100 пчаліных укусаў. Але такое можа здарыцца, калі раз'юшыць пчаліны рой. Як паводзіць сябе з небяспечнымі насякомымі, і што рабіць, калі ўкусаў не ўдалося пазбегнуць, расказала загадчык аддзела грамадскага здароўя Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Рэгіна ІВАНОЎСКАЯ.**

### ЯКАЯ БЫВАЕ РЭАКЦЫЯ НА ЎКУСЫ?

На ўкусы пчол, чмялёў, вос і шэршняў арганізм чалавека адказвае трыма відамі рэакцый. Найперш мясцовай — пачырваненне, ацёк, боль, сверб або моцнае смыленне ў зоне ўкусу, лакальнае павелічэнне лімфатычных вузлоў. Часам укусы робяць знешнасць непазнавальнай. Ацёк на твары асабліва небяспечны, калі ўкус у вобласці вуснаў ці ўнутры ротавай поласці. Гэтак жа небяспечныя ўкусы пад пахай або на геніталіях.

Агульнатаксічная рэакцыя здараецца пры многіх укусах — з'яўляюцца дрыжыкі, павышэнне тэмпературы, млоснасць і ваніты, галаўны боль, ламота ў суставах. А вось алергічная рэакцыя можа ўзнікнуць і на адзінкавыя ўкусы ў схільных да такіх рэакцый людзей — крапіўніца, ацёк Квінке ці нават анафілактычны шок.

Крапіўніца ўяўляе з сябе высыпанне, калі пухіры зліваюцца паміж сабой на фоне пачырванення скуры, што суправаджаецца моцным свербам. Ацёк Квінке ( «гіганцкая крапіўніца») — хутка нарастаючы ацёк скуры або слізістых. Ён можа ўзнікаць не толькі непасрэдна ў месцы ўкусу, але і ў любым іншым. Яго «ўпадабаная» лакалізацыя — твар, слізістая абалонка поласці рота, мяккае паднябенне, канечнасці, палавыя органы. Асабліва небяспечны алергічны ацёк гартані.

Пчолы кусаюць толькі раз у сваім жыцці. У іх на канцы джала маецца кручок, ён застаецца ў целе ахвяры разам з часткай брушка. Пчала з вырваным джалам гіне. Чмялі, восы і шэршні могуць уджаліць некалькі разоў. Іх джала — вострая іголачка.

### ЯК СУНЯЦЬ БОЛЬ?

Уважліва агледзьце месца ўкусу. Джала неабходна выдаліць разам з ядавітым мяшочкам, падчапіўшы пазногцем знізу ўверх. Пры гэтым старайцеся не сціскаць яго, каб рэшткі яду не трапілі ў ранку.

Пры агульнатаксічнай рэакцыі на месца ацёку варта пакласці лёд, грэлку з халоднай вадой або рушнік, змочаны ў вадзе, каб запаволіць усмоктванне яду. Нельга выкарыстоўваць для мясцовага ахаладжэння сырую зямлю ці гліну — гэта можа прывесці да заражэння слупняком або сэпсісу (заражэння крыві). Для памяншэння ацёку і мясцовага запалення можна выкарыстоўваць гідракарцізонавую або прэднізалонавую мазі. Пацярпеламу рэкамендуецца як мага больш піць.

Пры крапіўніцы назіраецца значнае зніжэнне артэрыяльнага ціску, таму трэба даць пацярпеламу 20-25 кропель кардыяміну або іншага сродку. Алкаголь катэгарычна супрацьпаказаны, бо ён садзейнічае павелічэнню пранікальнасці сасудаў, што прыводзіць да ўзмацнення ацёкаў.

Агульную алергічную рэакцыю змякчае прыём любога антыгістамінавага прэпарату (дымедрол, супрасцін). У астатнім першая дапамога такая ж, як і пры агульнай таксічнай рэакцыі: халодная грэлка да месца ўкусу, 20-25 кропель кардыяміну.

Пры цяжкай агульнай рэакцыі на ўкус у рот або вусны пацярпелага трэба хутка даставіць да ўрача — ацёк можа распаўсюдзіцца на гартань і выклікаць удушша.

### ДЗЕ ХАВАЕЦЦА НЕБЯСПЕКА?

Чмялі і шэршні — вялікія і прыгожыя насякомыя. Чмель падобны на велізарную пухнатую пчалу, а шэршань — вельмі вялікая і самая небяспечная з вос. Даўжыня яго дасягае чатырох сантыметраў. Восы і шэршні дружна і агрэсіўна абараняюць сваю калонію, а пчолы — вулей. Рой пчол можа атакаваць чалавека непадалёк ад пчальніка. Дзікія і здзічэлыя пчолы могуць зладзіць вулей у лесе ў дупле дрэва. Таму аматары «дзікага» мёду вельмі рызыкуюць.

Касматыя чмялі будуюць гнёзды пад зямлёй або ў старых пнях. Суполка чмялёў ніколі не бывае шматлікая, і яны нападаюць у адзіночку. Джаляць чмялі вельмі балюча, таму што ў рану трапляе да 2 мг яду — у 2,5 раза больш, чым пры атацы пчалы.

Пры ўкусе ўсяго аднаго шэршня ў дарослага чалавека могуць здарыцца ацёк, страта прытомнасці і агульнае ўдушша з цяжкай алергічнай рэакцыяй. Значна горш, калі нападае цэлая сям'я шэршняў. У арганізм трапляе такая колькасць яду, што чалавек можа не выжыць.

Таму ў месцах збору такіх насякомых варта захоўваць асцярожнасць. Не трэба непакоіць гнёзды вос, нават падыходзіць блізка непажадана. Памятайце, што пчол і вос прыцягвае водар парфуму, касметыкі і салодкіх прысмакаў — садавіны, варэння, мёду, а таксама яркае адзенне, асабліва з кветачным малюнкам.

Не спрабуйце заўзята адмахвацца ад насякомых. Калі аса села на ваш рукаў, бераўжліва страсіце яе і не ўздумайце прыстукнуць: пах яду для іншых агрэсараў — сігнал да агульнай атакі. Не хадзіце басанож па траве, асабліва па канюшыне, дзе магчымыя гнёзды чмялёў, і па пяску на пляжы, дзе часта застаюцца кавалачкі ежы, якімі ласуюцца восы і пчолы. У лесе, полі і пры рабоце ў садзе, на агародзе адзявайце галаўныя ўборы — насякомае, якое выпадкова заляцела ў валасы, з цяжкасцю выбіраецца і ад злосці джаліць у галаву.

Калі вы патурбавалі пчаліны рой або зламалі асінае гняздо, хуценька пакіньце «месца злачынства». Калі пчолы або восы кінуліся ў пагоню, нырайце пры магчымасці ў воду ці захутвайцеся з галавой у коўдру, закрывайцеся ў недаступным памяшканні і чакайце, пакуль яны супакояцца.

# ГОРАД-САД. ВІШНЁВЫ

На вуліцах «вішнёвай сталіцы» паўсюль «вішнёвы» дэкор.

## ЧАМУ МЕНАВІТА ГЛЫБОКАЕ?

Кліматычныя ўмовы Беларусі падыходзяць для вырошчвання вішні, у нас выдатна пладаносяць сарты сярэдняга тэрміну паспявання. У асноўным садаводы выкарыстоўваюць сарты беларускай селекцыі (Вянок, Грыёт Беларускі, Жывіца, Заранка, Ласуха і г. д.). Але самы, напэўна, старажытны і самы аўтэнтычны з тых, што дайшлі да нашых дзён, сорт беларускай вішні з'явіўся якраз у Глыбокім у пачатку мінулага стагоддзя. Першыя вішнёвыя сады заклаў у наваколіцах Глыбокага памешчык-селекцыянер Баляслаў Лапыр. Свой сорт аматар садоўніцтва назваў без вынаходстваў — «Вішня кіслая», а за аснову пры селекцыйнай рабоце ўзяў польскія сарты і спрадвечныя мясцовыя. Галоўнай вартасцю лапыроўскага сорту стала зімаўстойлівасць і здольнасць выдатна плоданасіць, нягледзячы на любыя капрызы надвор'я. З панскага саду «Вішня кіслая» перабралася ў сады навакольных вёсак і хутароў.

— Ягады сапраўды кіслыя?

— Кісла-салодкія, — кажа прадавец на мясцовым рынку. — І яшчэ ў гэтых вішань ёсць адметная рыса — такі, ведаеце, лёгкі смак чарэшні. Калі пакаштуеце — ужо не збытаеце нашы, глыбоцкія, вішні ні з якімі іншымі.

Мясцовы, глыбоцкі сорт вішні садаводы хваляць за тое, што яна непатрабавальная і марозаўстойлівая. Але вішня сама па сабе — досыць складаная ў вырошчванні культура. Вядома, што прыжываецца больш за 80 % яблыневых пасадак, а вішнёвых — усяго 20-25 %. Дрэўца не любіць скразнякоў, у яго шмат шкоднікаў (напрыклад, вішнёвую кару любяць аб'ядаць зайцы). І ўсё ж кожную вясну, у пару цвіцення вішнёвых садоў, Глыбокае нібы накрывае вэлюм нявесты, а штолета гарадок падобны на вялікі вішнёвы сад. Тут вішнёвыя дрэўцы ёсць без перабольшання каля кожнага жылога дома: ці то прыватны домік, ці то пяціпавярховік. Вішнёвыя дрэвы — абавязковы атрыбут навакольных вёсак ды хутароў. А ў 2013 годзе, за год да святкавання 600-й гадавіны заснавання гарадка, на ўездзе ў Глыбокае быў пасаджаны вішнёвы сад — 1414 дрэў. Лічба гэтая сімвалічная: упершыню горад згадваецца ў летапісах у 1414 годзе.

— Частку дрэў мы прывезлі з Батанічнага саду, але вельмі многія — менавіта наш, лапыроўскі сорт: саджанцы збіралі і ў самім Глыбокім, і па навакольных вёсках і хутарах, — распавядае **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Глыбоцкага райвыканкама Людміла КАРНІЛОВІЧ.** — Сад расце і пладаносіць, хоць мы не арыентаваліся на высокія ўраджаі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Помнік вішні.

Месца для яго было выбрана з пункту гледжання эстэтыкі, але наогул для вішнёвых дрэў яно занадта ветранае, а вішні не любяць скразнякоў. Таму сёлета плануем абсадзіць наш сад жывой агароджай з бэзу, каб стварыць перашкоду для ветру. Так ці інакш, ураджай наш сад дае кожнае лета, і любы ахвотны можа прыйсці туды і палакасавацца ягадамі.

## САМЫЯ ЭКАЛАГІЧНЫЯ

Вішні ў Глыбокім прадаюць на мясцовым рынку і на стыхійных міні-рынках. Збочваеш з цэнтральнай вуліцы, а там у цяньку — вішні ў вёдрах, клапатліва накрытых чыстай марляй, у кошыках, у літровых і паўлітровых слоічках.

— У мяне самыя салодкія, бярыце тут, там далей будуць кіслейшыя, — вітае мяне вясковая бабуля.

Да прыезджых тут прывыклі. Па вішні ў Глыбокае сапраўды едуць і з Мінска, і з Віцебска. Наогул, у Глыбокім летам дастаткова многа прыезджых для беларускай глыбінкі. Людзі едуць адпачываць на азёры. Сама назва мястэчка паходзіць ад старажытнай назвы возера ў межах горада. Хоць з XIX стагоддзя яно называецца Кагальскае — гэта значыць «агульнае», «супольнае» (ад «кагал» — яўрэйская абшчына). Тут праходзіла мяжа аселасці: у пазамінулым і ў пачатку мінулага стагоддзя каля 70 % насельніцтва Глыбокага былі яўрэі (з Глыбоччыны, дарэчы, родам знакаміты яўрэйскі лінгвіст і перакладчык Элізэр Бэн-Егуда, які адрадзіў іўрыт у якасці сучаснай гутарковай мовы). А недалёка ад горада знаходзіцца самае глыбокае ў Беларусі возера Доўгае, якое прыцягвае амаатараў дайвінгу — у Глыбокім кожнае лета праходзяць розныя дайверскія мерапрыемствы, злёты і фестывалі. Глыбіня Доўгага — больш за 53 метры, і гэта не канчаткова высветленая велічыня: дайверы даследуюць дно, і, магчыма, знойдуць яшчэ больш глыбокія ўчасткі. Так што гасціяцы ў Глыбокім летам не пустуюць, а іх у горадзе пяць. Плюс аграсядзібы па берагах азёр (дзень пражывання з харчаваннем — ад 30 да 50 рублёў).

Вішнёвыя прысмакі ад глыбоцкіх кулінараў.

Але вернемся да глыбоцкіх вішань. На рынках у буйных гарадах можна знайсці вішні з Грэцыі, з поўначы Турцыі, з Украіны і з поўдня Расіі. Але ў цёплых рэгіёнах, з веданнем справы расказваюць жанчыны, што прадаюць глыбоцкія вішні, дрэва садоўнікі вымушаныя апрацоўваць пестыцыдамі ад хвароб і шкоднікаў значна часцей, чым у беларускім клімаце. А спрадвечныя глыбоцкія, лапыроўскія вішні (калі верыць прадаўцам) наогул нічым не апрацоўваюць — яны, маўляў, самыя экалагічныя. Толькі ісці па іх лепш як мага раней.

Вішнёвая каралева і барон Мюнхаўзен кожны год вядуць «Вішнёвы фестываль» у Глыбокім.

— Большая частка прадаўцоў гандлюе вішнямі на рынку з 6 да 9 раніцы, — расказала Людміла Карніловіч. — Пазней ужо распрадаюць рэшткі.

Вішні, дарэчы, у Глыбокім даражэйшыя, чым у Мінску — попыт нараджае прапанову, і пяцілітровае вядзерца можа каштаваць 20 рублёў і нават даражэй. Цэны «ўзлятаюць» у дні Вішнёвага фестывалю, які сёлета пройдзе ўжо дзявяты раз, з 22 да 24 ліпеня. Дата фестывалю «плавае» — яна традыцыйна прымеркаваная да піку мясцовага ўраджаю вішань. Перад фестывалем і адразу пасля яго літровы слоічак глыбоцкіх вішань абыдзецца вам у 4-5 рублёў, вядзерца — у 12-15.

Вішні чым буйнейшыя, тым саладзейшыя. Ягады драбнейшыя — таннейшыя, іх купляюць на пірагі і варэнне. Слодыч залежыць і ад колеру — цёмныя ягады саладзейшыя чым ярка-чырвоныя, да таго ж у ягадах цёмнага колеру ўтрымліваецца больш антыаксідантаў. Выбіраць лепш цвёрдыя вішні, але пры слабым націсканні на ягадку (расказалі мне) павінна ўзнікаць адчуванне, што з яе гатовы пырснуць сок. Вельмі важна купіць спелыя (але не пераспелыя) вішні, таму што гэтыя ягады пасля таго як іх сарвалі з дрэва, больш не даспяваюць. Ну а прыкмета закісання вішань — выразны вінны пах. Ад такой пакупкі варта адмовіцца.

Вішні — ягады сардэчнікаў і «фітаняшак». Яны ўтрымліваюць збалансаваны комплекс вітамінаў (А, К, групы В) і мікраэлементаў (марганец, медзь, жалеза, фосфар, цынк і г. д.), дапамагаюць змагацца са старэннем скуры (паколькі багатая на антыаксіданты) і нармалізуюць работу сэрца (за гэта адказваюць калій і магній). А яшчэ гэтыя ягады памяншаюць ацёкі, расшчапляюць тлушчы, выводзяць таксіны і паляпшаюць метабалізм. Гэта прыроднае гарачкапаніжальнае і заспакаяльнае (у старажытнасці адвар з вішань ужывалі пры эпілепсіі). На рынку ў Глыбокім вам ахвотна раскажуць, што вішні дапамогуць пры склерозе і артрыце (калі з'ядаць у дзень па кілаграму ягад, запіваючы літрам малака), і нават пры ковідзе (па-першае, падтрымаюць імунітэт, па-другое, гэта старадаўні адхаркавальны сродак пры захворваннях дыхальных шляхоў).

## ТОЙ САМЫ МЮНХАЎЗЕН

У халадзільніку вішні захоўваюцца каля двух тыдняў. У маразільнай камеры — больш за паўгода (замарожваць вішню трэба без костачак). У слоічках з вішнёвым варэннем — колькі хопіць сілы волі. Калі варыце варэнне без костачак, яно захоўваецца даўжэй. З костачкамі — лепш з'есці на працягу некалькіх месяцаў, таму што ў костачках ёсць сінільная кіслата, якая з цягам часу можа трапіць у сіроп.

— Многія любяць вішнёвае варэнне з костачкамі з-за лёгкага міндальнага смаку, — кажа Людміла Карніловіч. — Але лепш усё ж костачкі выдаліць, а ў варэнне дадаць некалькі міндальных арэшкаў.

Калі варыце варэнне з вішань з костачкамі — пракаліце ягадкі ў некалькіх месцах. І абавязкова дадайце трохі вады, бо свежыя вішні з костачкамі дрэнна даюць сок, раіць бабуля, што гандлюе вішнямі на глыбоцкай вуліцы.

А наогул, з вішань можна гатаваць не толькі варэнне, пірагі і варэнікі. Напрыклад, спакон веку ў Глыбоцкім раёне соляць сала з вішнямі, Глыбоцкі мясакамбінат запатэнтаваў рэцэпт шашлыку ў вішнёвым соку, а Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат, які робіць знакамітую глыбоцкую згушчонку, дапоўніў лінейку згушчанага малака згушчонкай «Чэры-брэндзі». На «Вішнёвым фестывалі», які традыцыйна доўжыцца пяць дзён, можна прадэгуставаць самыя розныя (часам неверагодныя, але абавязкова смачныя, запэўнілі мяне) стравы з вішнямі ад прадпрыемстваў і проста ад мясцовых кулінараў. І, канешне, самі вішні з розных вёсак Глыбоцкага раёна. У 2017 годзе фестываль атрымаў статус міжнароднага: на яго прыязджаюць госці і ўдзельнікі з-за мяжы — з Расіі, Прыбалтыкі і нават Ізраіля (пабрацім Глыбокага — горад Кір'ят-Бялік). Дарэчы, лагатып фестывалю ў 2012 годзе распрацоўвала рэкламнае агенцтва «Крынь», прызёр фестывалю рэкламы «Канскія львы». Канчатковых варыянтаў было некалькі — у тым ліку алень з вішнёвым дрэвам на лбе і вішанькі-ноткі на нотным стане (у выніку быў абраны апошні варыянт). Чаму алень? Аказваецца, у Глыбокім, акрамя ўсяго іншага, яшчэ і пахаваны... барон Мюнхаўзен.

На старадаўніх могілках у цэнтры Глыбокага краязнаўцы знайшлі незвычайную магілу. На крыжы — надпіс, што тут пахаваныя Фердынанд і Вільгельміна фон Мюнхаўзен, і ўказаны год (1878). І хоць герой кнігі, як пішуць літаратуразнаўцы і гісторыкі, спачыў у 1797 годзе, у Глыбокім вырашылі ўстанавіць помнік «таму самаму Мюнхаўзену» і зрабіць барона часткай гарадской легенды. І ў год 600-годдзя Глыбокага на вуліцы Горкага з'явіўся бронзавы Мюнхаўзен вярхом на ядры — адна са славутасцяў, каля якой любяць фатаграфавацца і госці горада, і мясцовыя жыхары. Ці трэба казаць, што на капелюшы барона — галінка вішні?..

Вішні ў Глыбокім прадаюць не толькі на рынку, але і на вуліцах.

Яшчэ адна гарадская славутасць — помнік... каму б вы думалі? Правільна, вішні! Варыянтаў, як і ў выпадку з лагатыпам, было некалькі, але спыніліся на трох вішаньках на пастаменце. Кажуць, калі пацерці самі вішанькі — гэта да павелічэння сям'і (наведванне помніка вішні — абавязковая частка фотасесіі маладых пасля загса), калі пагладзіць лісцікі — да грошай. Ну а дакрануцца да галінак — да доўгага жыцця.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

белагропромбанк
традиции будущего

ОАО «Белагропромбанк»

С 21 июля 2021 года на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 15.07.2021 № 203, ставка рефинансирования устанавливается в размере 9,25 процентов годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006, и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006, на 0,75 процентных пункта с 21 июля 2021 года.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 13 февраля 2019 года выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551


## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **Хойникское районное потребительское общество** (УНП 400056838) 247618, Гомельская обл., г. Хойники, ул. Жукова, д. 3 в лице ликвидатора Беланова Руслана Николаевича, тел. +375 (29) 690-00-10.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **04 августа 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль GAZ SAZ 3507, рег. знак 0411 ГСМ, 1986 г. в. | 4 104,00 |
| 2 | Автомобиль GAZ 3302 AFIJ LUBAVA, рег. знак АК 7841-3, 2015 г. в. | 16 632,00 |
| 3 | Автомобиль GAZ 3302 BELAVA 1230, рег. знак АК 6326-3, 2014 г. в. | 9 504,00 |
| 4 | Автомагазин МАЗ 437043, рег. знак АЕ5238-3, 2009 г. в. | 9 504,00 |
| 5 | Трансформаторная подстанция ГКТП 202 РЦ04, инв. № 1588 | 5 400,00 |
| 6 | Плуг ПЛН 3-35П, инв. № 142 | 2 268,00 |
| 7 | Картофелесажалка Л-202, инв. №33 | 4 212,00 |
| 8 | Холодильная витрина бол., инв. № 1204 | 1 620,00 |
| 9 | Холодильная витрина бол., инв. № 1205 | 1 620,00 |
| 10 | Холодильная витрина бонета Голд., инв. 1089 | 1 728,00 |
| 11 | Холодильная витрина бонета Миранда, инв. 1027 | 1 728,00 |
| 12 | Павильон тентовый 4,5х6, инв. № 1575 | 1 944,00 |
| 13 | Павильон тентовый 4,5х6, инв. № 1576 | 1 944,00 |
| 14 | Компрессор, инв. № 92, стенд шиномонтажный ОМА-670, инв. 93, установка шиномонтажная, инв. № 91 | 2116,80 |

Местонахождение: п. 1–4 – г. Хойники, ул. Жукова, д. 3, п. 5–14 – г. Хойники, ул. Колесника, д. 63. Телефон для ознакомления и осмотра тел. +375 (29) 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 22.07.2021г. 09.00 по 03.08.2021 г. 16.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 18.05.2021 г.

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **Речицкое районное потребительское общество** (УНП 400037088) 247500, г. Речица, ул. Привокзальная, д. 2 в лице ликвидатора Беланова Руслана Николаевича, тел. +375 (29) 690-00-10.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **04 августа 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.** Прием заявок и задатков с 22.07.2021 г. 09.00 по 03.08.2021 г. 17.00. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 18.05.2021 г.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль ГАЗ 3309, автомагазин, 2012 г. в., рег. знак АІ 49-64-3 | 8 904,00 |
| 2 | Автомобиль ГАЗ 3309, автомагазин, 2006 г. в., рег. знак АА 56-86-3 | 7 392,00 |
| 3 | Автомобиль МАЗ 437043, автомагазин, 2009 г. в., рег. знак АА 17-10-3 | 11 760,00 |
| 4 | Автомобиль МАЗ 437043, автомагазин, 2009 г. в., рег. знак АА 17-09-3 | 11 760,00 |
| 5 | Автомобиль МАЗ 457043, автомагазин, 2014 г. в., рег. знак АК 53-74-3 | 14 112,00 |
| 6 | Автомобиль ГАЗ 3309, автомагазин, 2008 г. в., рег. знак АА 59-80-3 | 8 904,00 |
| 7 | Автомобиль ГАЗ 3309, фургон, 2008 г. в., рег. знак АА 78-24-3 | 3528,00 |
| 8 | Автомобиль МАЗ 555120 225, 2001 г. в., рег. знак АВ 1441-3 | 13 284,00 |
| 9 | Фургон ГАЗ 3309, 2007 г. в., рег. знак АВ 78-25-3 | 2 592,00 |
| 10 | Фургон ГАЗ 3309, 2008 г. в., рег. знак АМ 70-89-3 | 2 448,00 |
| 11 | Бортовой тентованный МАЗ 4371Р2, 2013 г. в., рег. знак АК 28-43-3 | 15 600,00 |
| 12 | Фургон изотермический ГАЗ-3309, 2009 г. в., рег. знак АА 04-74-3 | 3 024,00 |
| 13 | Фургон хлебный ГАЗ 3302, 2014 г. в., рег. знак АК 53-19-3 | 3 744,00 |

Местонахождение: п. 1–6, 11, 12 – Гомельская обл., г. Речица, ул. Молодежная, 5, п. 7–10 – Гомельская обл., г. Речица, ул. Привокзальная, 2, п. 13 – Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Василевичи, ул. Комсомольская, 74.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **23 августа 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.** Прием заявок и задатков с 22.07.2021 г. 09.00 по 20.08.2021 г. 17.00.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль МАЗ 437041-262, грузовой (бортовой, тентовый), 2007 г. в., рег. знак АА 9107-3 | 8 400,00 |
| 2 | Трактор МТЗ-82, 1986 г. в., номерной знак 2737 ДШ | 4 440,00 |

Местонахождение: п. 1, 2 – Гомельская обл., г. Речица, ул. Привокзальная, 2.

Телефон для ознакомления и осмотра +37533 643-43-14.

**Для участия в торгах необходимо в установленный срок:** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее десяти рабочих дней со дня проведения торгов.

В соответствии с действующим законодательством, ООО «СКИФ» (УНП 600046428) уведомляет своих кредиторов о реорганизации в форме выделения из него ООО «РелипТрейд».

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

## «Июнь на Драйве! Мастеркард»

**1. Сведения об организаторе:**
Организатором рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Организатор) с местом нахождения по адресу: 220030, Беларусь, г. Минск, пл. Свободы, д. 4, офисное помещение № 334. Электронный адрес: post@forte.by.

**2. Наименование рекламной игры:**
«Июнь на Драйве! Мастеркард».

**3. Срок начала и окончания рекламной игры:**
01 июня 2021 г. – 12 августа 2021 г.

**4. Сведения о государственной регистрации рекламной игры:**
Рекламная игра зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 14 мая 2021 года, свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3991.

**5. Сведения о количестве участников рекламной игры:**
В рекламной игре приняло участие 59383 участника.

**6. Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда:**
Призовой фонд разыгран полностью.

**7. Фамилия, инициалы победителя (победителей), его выигрыш (их выигрыши):**

| Наименование Приза | Ф.И.О. Победителя |
|---|---|
| Автомобиль: NISSAN QASHQAI<br>Год выпуска: 2021<br>Цвет кузова: черный металлик<br>стоимостью 50 000,00 белорусских рублей и денежные средства в сумме 7 448,85 белорусских рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза | Гутов Р.В. |

**8. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры** + 375 29 678 94 39.

## ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ

### ОАО «Элегант» уведомляет акционеров о покупке на баланс Общества акций простых (обыкновенных) собственного выпуска с целью сокращение их общего количества (аннулирования)

Полное наименование и место нахождения – Открытое акционерное общество «Элегант», г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1, телефон (8 232) 32-17-40.

Полное наименование, место нахождения открытого акционерного общества, акции которого приобретаются – Открытое акционерное общество «Элегант», г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.

Цель приобретения акций, определенная общим собранием акционеров, на котором было принято решение о таком приобретении, – сокращение их общего количества (аннулирование).

Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель, – 2 000 (две тысячи) штук простых (обыкновенных) акций.

Фиксированную цену покупки акций, установленную общим собранием акционеров, – 10.00 (десять) белорусских рублей.

Порядок и форма расчетов – зачисление денежных средств в безналичной форме в белорусских рублях на банковский счет, открытый на имя акционера, в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь в срок не позднее 30 (тридцати) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи акций.

Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций, – г. Гомель, ул. Интернациональная, 13, 4-й этаж, каб. 403 (ЗАО «Западное фондовое бюро»).

Даты начала и окончания срока представления акционерами предложений о продаже акций. Срок представления акционерами предложений о продаже акций – с 05.07.2021 г. по 28.07.2021 г.

Даты начала и окончания покупки акций. Срок, в течение которого осуществляется приобретение акций: заключение договоров – с 30.07.2021 по 31.08.2021 г., оплата в срок не позднее 30 (тридцати) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи акций.

УНН 400078331 ***Наблюдательный совет.***

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Наименование объекта/ адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т. ч. ограничения и условия в его использовании | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **переулок Путейский, 3** (площадь застройки – 114 кв. м, готовность 11 %) и земельный участок | 140100000001032570 | 0,1073 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **37 191,03** | 7 400,00 | **3 074,06** | 0,0050 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; 0,0083 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления) | Газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение, канализация |
| 2 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **улица Черемуховая, 60** (площадь застройки – 162 кв. м, готовность 6 %) и земельный участок | 140100000001021945 | 0,1007 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **21 617,52** | 4 300,00 | **2 646,88** | 0,0021 га – охранная зона линий, сооружений электросвязи и радиофикации; 0,0030 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления) | Газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение, канализация |
| **Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 | | | | | | | | | **2 900,00 рублей** |
| **Организатор аукционных торгов –** КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактный телефон 53 81 92 | | | | | **Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924 в срок до 18.08.2021 г.** | | | | |

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе**, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

• подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

• в течение одного месяца с момента государственной регистрации получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на приусадебной территории на предоставленном земельном участке;

• разработать в установленном порядке проектную документацию на строительство одноквартирного жилого дома;

• представить изготовленную проектную документацию на согласование в Брестский городской исполнительный комитет;

• завершить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством.

**Аукцион состоится 24 августа 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются с 8.30 21.07.2021 г. до 17.00 18.08.2021 г. (перерыв с 13.00 до 13.45; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50-23.**
**Контактный телефон 53 81 92. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by, www.brest-region.gov.by и www.gki.gov.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | **ОАО «СКБЗ «Альбертин», Гродненская обл., г. Слоним, ул. Фабричная, д. 1** |

**Предмет аукциона**

**Здание молодежного центра (здание нежилое),**

общ. пл. **909,3 кв. м**, инв. № **450/С-158**, адрес:

Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Колхозная, д. 8. Составные части и принадлежности (согласно техническому паспорту): теневой навес, забор (2 шт.), ворота (2 шт.), калитка.

**Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество,** установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной.

**Земельный участок** пл. 0,3894 га предоставлен на праве постоянного пользования

**Начальная цена: 160 320,00 бел. руб. (с НДС 20 %)**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнуты договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **2 %** от цены продажи предмета электронных торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» 08.06.2021

Дата и время начала и окончания торгов: **24.08.2021 с 11.00 до 13.00**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 20.08.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

## Извещение (информация) о проведении 4 августа 2021 года повторных аукционных торгов по продаже машино-места в г. Минске, находящегося в государственной собственности

| Сведения о предмете торгов | | |
|---|---|---|
| Наименование, местонахождение и характеристики продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| **«Машино-место № 218»** по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 87-218 (площадь – 18,0 кв. м, инвентарный номер 500/D-708020466) | 18 115,01 | 1 000,00 |

**Продавец имущества:** РУП «БЕЛСТРОЙЦЕНТР», 220036, г. Минск, ул. Р. Люксембург, 101, тел. (017) 270-16-93.

**Организатор торгов**: государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 365-48-36.

**Форма проведения торгов:** открытый аукцион на повышение начальной цены.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.

Аукционные торги проводятся **4 августа 2021 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **по 02.08.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты проведения аукциона.

**Порядок оформления участия в торгах**

К участию в торгах допускаются юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные юридические лица, граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, лица без гражданства, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в торгах, на указанный текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка по предмету торгов, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором торгов соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения торгов, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах и получившие билеты участников торгов с указанием даты регистрации заявления.

**К заявлению прилагаются:**

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, **с отметкой банка** (задаток перечисляется на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в повторных аукционных торгах от 04.08.2021) в срок, установленный для приема документов;

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

